Замарожаныя вёскі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Гала-канцэрт ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 07 (2805) Год LV | Беласток, 14 лютага 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Гісторыя і сучаснасць Ласінскага прыхода

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Аўтары кніжкі „Ласінка. Прыход на акраіне Лядскай пушчы" айцец Рыгор Сасна і матушка Антаніна Троц-Сасна пачулі многа вельмі цёплых слоў наконт свайго выдання (злева рэдактар выдання Дарафей Фіёнік)

Нядаўна выйшла з друку чарговая гістарычная кніжка аўтарства доктара тэалагічных навук, мітрафорнага протаіерэя Рыгора Сасны і матушкі Антаніны Троц-Сасны аб Ласінскім праваслаўным прыходзе. На аўтарскую сустрэчу, наладжаную 7 лютага ў Епархіяльным цэнтры праваслаўнай культуры ў Крыўцы, прыбыло шмат прыхаджан і запрошаных гасцей, сярод якіх было многа святароў. У час прэзентацыі кніжак „Ласінка. Прыход на акраіне Лядскай пушчы" і „Кнігазбор" (пісаў я пра яе раней), выдадзеных Музеем малой бацькаўшчыны ў Студзіводах пад рэдакцыяй Дарафея Фіёніка, іх аўтары, айцец Рыгор Сасна і матушка Антаніна Троц-Сасна пачулі многа вельмі цёплых слоў, асабліва наконт выдання пра Ласінку і яе наваколле. Гісторык Славамір Іванюк расказаў таксама пра шматгадовую руплівую працу айца Рыгора і матушкі Антаніны ў галіне збірання і публікавання мясцовай гісторыі. Так, як шматлікія мясцовыя прамоўцы, настаяцель Ласінскага прыхода протаіерэй Георгій Кос, які разам са студзіводскім музеем быў арганізатарам спаткання, моцна дзякаваў аўтарам кніжкі за апублікаванне падрабязнай гісторыі ягонай парафіі.

— Кніжка пра Ласінскі прыход гэта тытанічная работа і вялікая крыніца ведаў пра нашых продкаў. Чытаючы яе можна многа даведацца пра жыццё і спосаб думання нашых прадзедаў, — заявіў гісторык Славамір Іванюк.

Новая кніжка распачынаецца з вопісаў месц побач ракі Нарвы, дзе захаваліся сляды даўніх гарадзішчаў, курганоў ці пасяленняў. Гутарка ідзе між іншым пра курганы каля Ласінкі і Кутавой, якія датуюцца на III-IV стагоддзі нашай эры, а можа нават і на ранейшы час. Аднак аўтары выдання звяртаюць увагу, што, на жаль, гэтыя помнікі мінуўшчыны даследаваны былі толькі павярхоўна і таму зараз мала можна сказаць пра жыццё на нашых землях у больш далёкім мінулым.

— Ласінка і навакольныя вёскі ўзніклі адносна позна. Аднак многа археалагічных аб'ектаў сведчаць, што людскія сялібы былі тут здаўна. У час рымскіх уздзеянняў жылі тут готы, пасля іх месца занялі балты, каб пасля саступіць славянам, — лічаць айцец Рыгор і матушка Антаніна.

Ласінскі прыход адносна малады ў параўнанні з суседнімі, бо быў створаны толькі ў 1778 годзе. У новым выданні можна многа прачытаць пра прыхадское жыццё, бо захаваліся ўсе ласінскія метрыкі і іншыя дакументы, што сведчаць таксама пра свецкае жыццё на працягу звыш двухсот гадоў дзейнасці парафіі. Многа можна прачытаць таксама пра пабудову ў канцы XIX стагоддзя другой, сённяшняй драўлянай царквы, якая нядаўна была прыгожа адрамантавана (яе выява красуецца на вокладцы кніжкі). З Ласінскага прыхода выводзіцца многа святароў, пра якіх можам прачытаць у выдадзенай кніжцы.

— Ласінскі прыход — адзіны на Беласточчыне, дзе захаваліся ўсе метрыкі. Святары з гэтай парафіі не дастасоўваліся да ўказанняў улад і не здавалі метрык у архівы, а перад бежанствам упакавалі іх у скрыню і зацягнулі на званіцу, дзе бяспечна праляжалі да нашага часу, — заявіў айцец Рыгор. Матушка Антаніна звярнула ўвагу на багацце інфармацыі пра Ласінскую парафію, якая захавалася ў архівах. У далёкім мінулым у Ласінскім прыходзе было звыш 3 тысяч прыхаджан, а зараз іх толькі 906 асоб. Асабліва моцна скарацілася колькасць парафіян у апошнім часе.

— Сын святара з Ласінкі Юзэф Шчэпан Кавалеўскі сябраваў з Адамам Міцкевічам, быў філаматам і за сваю дзейнасць быў сасланы. Развучыў вельмі добра мангольскую мову і быў вядомым мангалістам, выкладчыкам, а пасля і рэктарам вышэйшых навучальных устаноў, — заявіў мітрафорны протаіерэй Васіль Рошчанка, благачынны Нарваўскага дэканата. Апошнім часам айцец Васіль стаў даследаваць жыццё гэтага выхадца з нашых зямель і зачытаў таксама артыкул пра яго з польскай энцыклапедыі, дзе пра Юзэфа Шчэпана Кавалеўскага пішацца як пра першага польскага мангаліста.

У новым выданні можна таксама даведацца пра трагічны лёс жыхароў Ласінскага прыхода ў перыяд Напалеонаўскага шэсця, Лістападаўскага і Студзеньскага паўстанняў, сусветных войнаў. Вельмі многа людзей з гэтай парафіі падалося ў бежанства ў 1915 годзе, дзе частка з іх памерла і не вярнулася на радзіму. З кніжкі „Ласінка. Прыход на акраіне Лядскай пушчы" можна многа цікавага даведацца таксама пра гісторыю і сучаснасць паасобных вёсак гэтага прыхода, з ліку якіх зараз самая вялікая Ласінка. Па колькасці жыхароў уступаюць ёй Крывец і Барысаўка. Самая Ласінка ў мінулым была гмінным асяродкам. Стала ім ужо ў другой палове XIX стагоддзя і тады ў Ласінскай гміне было 48 вёсак і пасёлкаў, якія належалі да Ласінскага і Нарваўскага прыходаў, а ў 1897 годзе жыло на тэрыторыі Ласінскай гміны 6 724 чалавек. Ласінская гміна адрадзілася таксама ў міжваенны перыяд і ў пачатку пяцідзесятых гадоў XX стагоддзя. Гмінная народная рада была ліквідавана ў Ласінцы толькі ў 1972 годзе, у час самаўрадавай рэформы. Зараз вёскі Ласінскага прыхода распаложаны на тэрыторыі чатырох гмін — Нарваўскай (найбольш), Гайнаўскай, Чыжоўскай і Нараўчанскай (Крыніца) гмінах.

Мы рады, што аўтары кніжкі змясцілі многа перадрукаў з нашага тыднёвіка „Ніва", спасылак на нашы публікацыі і напісалі пра мясовы беларускі фальклор. Асобная частка ў кніжцы азагалоўлена „Беларуская народная абраднасць у Ласінцы і наваколлі". Можна тут даведацца пра абрады і пазнаёміцца з мясцовымі абраднымі песнямі.



ЗАПРАШАЕ

Аб'яднаньне Бацькоў

Stowarzyszenie na rzecz dzieci i młodzieży uczących się języka białoruskiego „AB-BA"

15-459 Białystok
ul. Częstochowska 6a lok.8
Дыскусійны клуб „АБ-БЫ"
Пагаворым пра альтэрнатыўную адукацыю

з Данутай Курань

Сустрэча з Данутай Курань — старшынёй Адукацыйнага фонду Яцка Кураня, суарганізатаркай Народнага ўніверсітэта ім. Яна Юзэфа Ліпскага ў Тэрэмісках.

Запрашаем
12.02.2010 г.
кафэ „Капілювак"
вул. Сянкевіча 9 у Беластоку
у **18.00**

Projekt realizowany dzięki dotacji Zarządu Województwa Podlaskiego.

Самакіраванне па-беларуску

Ужо колькі год запар людзі наракалі на тое, што няма сапраўднай зімы. Наракалі, наракалі і данаракаліся. У гэтым годзе, не зважаючы на раставанне леднікоў і напаўшае на планету глабальнае пацяпленне, зіма засыпала снегам усю Еўропу. Беларускія дарогі таксама аказаліся засыпаныя. Але з гэтым пачала ваяваць снегаачышчальная тэхніка. Таму па дарозе неяк праехаць можна. Цяжэй на тую дарогу трапіць, бо двары занесеныя снегам так, што буксуюць нават трактары.

Таму Міхалыч, руплівы і працавіты чалавек, падняўся на гадзіну раней чым заўсёды, узяў рыдлёўку і расчысціў не толькі шлях, па якім ён і іншыя могуць спакойна выехаць з двара, але і месца, дзе стаіць яго машына, каб вечарам, пасля працы, можна было спакойна сюды заехаць.

Але пралічыўся. Вечарам, вяртаючыся дахаты, ён убачыў, што на расчышчаным ім ад снегу месцы ўжо стаіць суседская машына. Міхалыч пайшоў да суседа і паспрабаваў абудзіць у яго душы нейкае сумленне і паняцце справядлівасці. Ды сусед адказаў, што пад хатай месцы не падпісаныя, і кожны мае права ставіць машыну там, дзе яму зручна.

Міхалыч мусіў пагадзіцца, што на расчышчаным ад снегу месцы сапраўды ставіць тэхніку зручна. Ён, цяжка ўздыхнуўшы, зноў узяў у рукі рыдлёўку і да поўначы адкапаў для свайго аўто яшчэ адну стаянку. Але назаўтра і на гэтым расчышчаным месцы стаяла машына ўжо другога суседа. Міхалыч адкапаў яшчэ адно месца. Але сітуацыя зноў паўтарылася. Нарэшце дайшло да таго, што на яго расчышчаныя месцы сталі ставіць машыны людзі з суседскіх дамоў, а яму ўжо нават не было куды заехаць. Тады Міхалыч вырашыў дзейнічаць па-іншаму. Ён абышоў усе кватэры, гаспадары якіх ставяць машыны пад хатай, і прапанаваў ім расчысціць ад снегу ўсю пляцоўку. Каб усім было добра.

На Міхалыча глядзелі як на дурня. Адны сказалі, што не маюць часу, другія — рыдлёўкі, трэція — жадання. І Міхалыч, узлаваўшыся, пайшоў адзін. Расчысціў месца для сваёй машыны. А раніцай, выязджаючы, зноў яго засыпаў снегам. І так кожны дзень. Ён і не чакаў, што такімі дзеяннямі вельмі ўзлуе суседзяў. Яго проста сталі ненавідзець. Як жа так! Навошта ён засыпае расчышчаныя месцы?! Яму што, шкода, каб хто там машыну сваю паставіў?!

Не ведаю, што з ім або з яго машынай зрабілі б (бо ўжо кучкаваліся і намаўляліся да помсты), каб нечакана сітуацыя не павярнулася другім бокам. Аказваецца Адтуль, дзе сядзяць Самыя Разумныя ў Беларусі Людзі, сказалі, што жыхары могуць самі расчысціць снег ля сваіх дамоў. Старшыні жыллёвых кааператываў адрэагавалі імгненна і выцягнулі жыхароў на суботнік. Усе падпарадкаваліся, сказалі, што маюць час, рыдлёўкі і жаданне, і толькі аднаго дзівуюць, як яны раней самі не дадумаліся да такой мудрай рэчы. І ў той час, калі ўкраінцы рыхтаваліся да прэзідэнцкіх выбараў і, не звяртаючы аніякай увагі на тое, што і ў саміх пачаліся выбары ў мясцовыя саветы, якія і павінны будуць вырашаць пытанні мясцовага ўпарадкавання, пачалі суботнічаць.

Пачысцілі пляцоўку і каля Міхалычавай хаты. Праўда яго, Міхалыча, не паклікалі. А снег кідалі на яго машыну. Засыпалі яе цалкам. І зараз, у двары, ёсць толькі адно нерасчышчанае месца. Там, дзе стаіць машына Міхалыча. І выехаць яна ўжо ажно да вясны не зможа, бо засыпаная цалкам.

Міхалыч ажно заплакаў. Пасля доўга думаў, за што над ім так паздзекаваліся. Ён жа хацеў як лепей. І такі суботнік яшчэ раней усім прапаноўваў зрабіць. А пасля зразумеў, што не яго гэта справа думаць, выходзіць з ініцыятывамі і прапановамі, ды выглядаць разумнейшым за Начальнікаў Рэспубліканскага Значэння. Бо жыве ён не ў той краіне, дзе штосьці можна рабіць без загаду зверху. Трэба спакойна, як усе, цярпліва чакаць, калі нам дазволяць прыбіраць снег ля нашых дамоў, садзіць бульбу або збіраць плён. І пайсці датэрмінова прагаласаваць таксама трэба, ды яшчэ за каго трэба. І тады начальства, і там дзе жывеш, і дзе працуеш, на цябе не будзе глядзець коса. А значыць будуць любіць так, што як прыйдзе час, паклічуць на суботнік. Вось такое яно, беларускае самакіраванне.

Віктар САЗОНАЎ

Заклік Беластоцкага тэлецэнтра

У выніку радыкальнага падзення прыходаў ад абанемента Польскае тэлебачанне Аддзел у Беластоку апынулася ў трагічным фінансавым становішчы.

На дзейнасць у 2010 годзе атрымалі мы суму 8.303.000 зл., што ў параўнанні з мінулым годам, калі мы распараджаліся сумай 13.800.000 зл., складае квоту на 40% меншую. **Сёлетніх фінансавых сродкаў хопіць Беластоцкаму тэлецэнтру толькі на пакрыццё абмежаваных гадавых сталых коштаў і на забеспячэнне на працягу 3 месяцаў прадукцыі і трансляцыі інфармацыйных аглядаў апошніх падзей „Аб'ектыў" і цыклічных рэлігійных ды нацменшасных праграм.** На трансляцыю толькі гэтых, дакладна кажучы, місійных праграм на працягу 2010 года спатрэбіцца дадаткова больш за 1.200.000 зл.

Распараджаючыся прызначанымі кіраўніцтвам Беластоцкаму аддзелу Польскага тэлебачання сродкамі, мы не зможам выконваць публічнай місіі, дзеля якой мы былі створаны Краёвай радай радыёвяшчання і тэлебачання — у сувязі з гэтым не будуць рыхтавацца і выходзіць у тэлеэфір праграмы, якія папулярызуюць спорт, гісторыю нашага рэгіёна і сюжэты з жыцця жыхароў Падляшша.

Ужо ў студзені мы прыпынілі аж да адмены выхад у тэлеэфір такіх перадач як:

— культурная праграма „Прыпынак Культура" (*„Przystanek Kultura"*),

— праграма для інвалідаў „Мы ёсць" (*„Jesteśmy"*),

— цыклы рэгіянальных рэпартажаў „Пазітыўныя" (*„Pozytywni"*) і „Стоп! Рэпартаж" (*„Stop! Reportaż"*),

— інтэрвенцыйная праграма „Маецца справа" (*„Jest Sprawa"*) і паланійная „Яднае нас Польшча" (*„Łączy nas Polska"*),

— дарожны інфарматар „Шырокай дарогі" (*„Szerokiej Drogi"*),

— прэвентыўная праграма „Зона бяспечнасці" (*„Strefa Bezpieczeństwa"*),

— грамадска-палітычныя перадачы „Падляшскі самаўрадавы і парламентарны форум" (*„Podlaskie Forum Samorządowe i Parlamentarne"*).

Пад пагрозай апынуўся выхад у тэлеэфір штодзённай перадачы „Госць дня" (*„Gość Dnia"*).

На ўтрыманне тэлецэнтра і рэалізацыю праграм у версіі, якая дазваляла б задаволіць асноўныя патрабаванні гледачоў у рэгіёне ў 2010 годзе, Беластоцкаму аддзелу патрэбна яшчэ каля 11.000.000 зл.

Звяртаемся да Вас з драматычным заклікам дапамагчы ў выратаванні Беластоцкага цэнтра Польскага тэлебачання і падтрымаць пошукі ўсялякіх форм фінансавання нашай прадукцыі. У адваротным выпадку пагражае нам поўная маргіналізацыя і звядзенне Беластоцкага тэлецэнтра да статусу трансляцыйнай станцыі, што на практыцы абазначае, што будзем выконваць ролю рэгіянальнай рэдакцыі, якая будзе рыхтаваць адзіночныя інфармацыі для цэнтральных тэлестанцый.

Мы ўсведамляем, якая страта спасцігне наш рэгіён, — таксама ў стварэнні іміджу Падляшша на агульнапольскім форуме, — калі б такое пераўтварэнне тэлецэнтра стала рэальнасцю, і тое, што адбудова нашага патэнцыялу стала б практычна ўжо немагчымай.

З павагай
Дырэктар Асяродка Польскага тэлебачання ў Беластоку
Уладзіслаў ПРАХОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Зубр Тарасэвіча

Кожны рэгіён цяперашняй Еўропы (асабліва тае задзіночанай) мусіць знайсці не толькі свае козыры, дазваляючыя развівацца, але таксама паралельна шукаць спосабаў, каб заахвоціць да сябе, прыцягнуць інвестараў і турыстаў, значыць, стаць прыцягальным для іншых. Такой мэце служаць сродкі па вылучэні кожнага з рэгіёнаў, а ў выніку, ствараючыя магчымасць лёгкага асацыявання рэгіёна з яго козырамі. Несумненна, адным з такіх „відных" сродкаў з'яўляецца лагатып. У прынцыпе мусіць ён асацыявацца з рэгіёнам праз яго мастацкае адлюстраванне, якое прыцягне ў першую чаргу ўвагу, а ў другую, у вельмі скарочанай форме, будзе сігналізаваць тое, што якраз прыцягальнага можа за ім скрывацца. Падляшскі рэгіён узяўся ў апошні час за такое выяўленне. Маршалак ваяводства Яраслаў Дважанскі склікаў спецыяльную прэс-канферэнцыю, у час якой быў прадстаўлены новы рэгіянальны апазнавальны знак. Яго аўтарам з'яўляецца вядомы ва ўсім свеце мастак з Валіл, прафесар Акадэміі мастацтваў у Варшаве Лявон Тарасэвіч (свядомы беларус). Самае цікавае, а што — на маю думку — сведчыць аб адносінах самаўрадавых улад ваяводства да гэтага мастака, запрошаны быў ён запраектаваць лагатып без аб'яўлення конкурсу ці аўкцыёну. Новы знак Падляшша гэта выява зубра са шматкаляровых маленькіх квадрацікаў. У некаторых яго варыянтах паяўляецца надпіс „bogactwo różnorodności". Стары лагатып — цёмны абрыс зубра, зялёны фрагмет елкі і надпіс „падляшскае".

У час прэс-канферэнцыі маршалак Дважанскі адзначыў:

— Стратэгія развіцця Падляшскага ваяводства з мінулага года прадбачвала, што выява зубра для прамоцыі ваяводства з'яўляецца добрай задумай. Затое знак, які мы мелі да гэтай пары, палічылі мы шэрым, устарэлым і ніякім, цяжкім для перанясення на іншыя рэкламныя носьбіты.

На думку Лявона Тарасэвіча, найбольшай праблемай у час праектавання новага лагатыпа было тое, каб нікога не пакрыўдзіць:

— Я стараўся адысці ад якіх-небудзь нацыянальных сімвалічных значэнняў.

Мастак не скрывае, што пры апрацоўцы падляшскай прыкметы выйшаў ад спасылкі на народную ткацкую традыцыю (сам ён выпускнік ткацкага класа Мастацкага ліцэя ў Супраслі, пасля факультэта жывапісу АМ у Варшаве):

— Я выкарыстаў тры элементы. Папершае: вярнуўся да маёй тэхнічнай адукацыі. Па-другое: спаслаўся на тое, што раблю ў маёй творчасці. Па-трэцяе: праца мусіла быць сучаснай. Разам з Пшэмыславам Казаноўскім [камп'ютэрная апрацоўка лагатыпа — М. Х.] мы стараліся, каб ён быў мадэрным. Папярэдні знак меў у сабе відавочныя сямідзесятыя гады мінулага стагоддзя. Гэты, можа, так хутка не састарэецца?

Лагатып Лявона Тарасэвіча будзе найважнейшым элементам Ідэнтыфікацыйнай візуальнай сістэмы ваяводства, значыць, апынецца на ўсім, што звязана з рэгіёнам: на візітных картках, буклетах, плакатах, розных гаджэтах такіх як кубкі, аўтаручкі, але і на кузавах службовых машын Падляшскай маршалкоўскай управы.

— Маю надзею, што гэтая гульня каляровых квадрацікаў хутка стане апазнавальнай тут, ва ўсёй Польшчы, і па-за межамі краіны, будзе асацыявацца з разнароднасцю Падляшскага ваяводства тым, што мы такія зялёныя, такія багатыя разнастайнасцю, — упэўнены маршалак Дважанскі.

Лявон Тарасэвіч дагэтуль быў аўтарам лагатыпаў м.інш. Еўрапейскага года культурнага дыялога (быў таксама яго амбасадарам) ды Кангрэса польскай культуры. 22 лютага новы падляшскі лагатып мае быць першы раз публічна паказаны ў час адкрыцця Дома ўсходняй Польшчы ў Бруселі.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Замарожаныя вёскі

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Аляксандр Малатовіч, жыхар Сушчага Барка, сам сабе дроў не нарубае, цяжка насіць ваду, нават цяжка сабе наварыць. Але не здаецца.

На сваім

На халадзільніку пакет, а ў ім можа з дваццаць булачак. Кухонная сцяна выглядае як кастрог, уся ў дровах. Хатка чыгуначнага майстра пабудаваная яшчэ ў царскіх часах. І „царскія" вокны яшчэ.

— Хацеў я адкупіць ад чыгункі гэты домік, але ён надта блізка чыгуначнага пуці і закон не дазваляе, — кажа ўжо без жалю Аляксандр Малатовіч, жыхар Сушчага Барка. — Тады дажываю тут, не ў сваім, але хто тут хацеў бы жыць. Тут сыплецца, там таксама, але стаіць ужо столькі гадоў, то можа і не ўпадзе.

Пару гадоў таму спадар Аляксандр пацярпеў ад інсульту. Сам сабе дроў не нарубае, цяжка насіць ваду, нават цяжка сабе наварыць. Але не здаецца.

— Не тое, што зімы баюся, але сам не дам рады. Прыязджаюць дзяўчаты з сацыяльнай дапамогі, нават учора павінна адна прыйсці, але можа захварэла. Зараз людзі часта хварэюць. Прыйдзе, пасядзіць, загаворыць, прынясе вады. Заўсёды ў чымсьці там дапаможа.

Спадар Аляксандр не мае праточнай вады. Як большасць старых, самотных людзей не мае ні купальні, ні прыбіральні. Яго туалет — ацеплены, а нават можна сказаць прыаздоблены квяцістым матэрыялам — распаложаны ў пару кроках ад хаты.

— Мне ўжо іншы туалет непатрэбны. Раней думаў можа, каб ваду пацягнуць пад хатай, устанавіць помпу. Тады не трэба было б вымаць дубальтовага акна і цягнуць ваду са студні. Трэба таксама і больш паліць.

У хаце вельмі цёпла, можна нават сказаць, што горача. На стале сушацца лупіны апельсіна.

— Кажуць, што моль не любіць паху апельсінаў, — тлумачыць спадар Аляксандр. — Не сядае на тэлевізар зараз, не бачу апошнім часам, можа і фактычна прапала.

На століку ля ложка ляжыць мабільнік.

— Часам патэлефаную камусьці. Дзеці мяне не наведваюць. Часам да апекі пазваню. Брат з сястрою таксама хварэюць, то і не прыязджаюць да мяне. „Смага" мне дапамагае. Ён там, з другой вёскі. Не буду тлумачыць чаму яго „Смагай" называюць, — смяецца спадар Аляксандр. — Як тут загляне ў вёску, то мне дапамагае. Гэтыя апельсіны то ён мне купіў. Расчысціць снег, дроў прынясе, нарубае. Лепш яму заплачу, а не буду чакаць ласкі. На сям'ю лепш не разлічваць. Можа сёння або заўтра загляне. Не ведаю, калі будзе. Калі ёсць, дык ёсць. Можа не засыпле снегам за ноч, а як засыпле, то папрашу „Смагу".

* * *

Пару дзесяткаў кіламетраў далей, у падбельскай вёсцы дзед Іван турбуецца з-за чарговых снегападаў.

— Можа вам той дах ад снегу ачысціць? Папрасіць кагосьці?

— Не, не. Дах не пусціць. Найгорш, калі б дождж пайшоў. Тады былі б праблемы. Не адзін дах мог бы не вытрымаць.

Хаця зіма вельмі жорсткая, то вакол хаткі няма прызбы, без якой калісьці немагчыма было сабе ўявіць падрыхтоўку да зімы. Няма ўжо дроў таксама.

— Ай... прызбы ўжо няма што рабіць. Можна пражыць. Найгорш, што дровы скончыліся. Неяк малавата нагатовілі. Дзеці купілі вугалю, але паліць вугалем то не тое. О, бачыце? Дагарае.

У дзеда Івана неяк халадней чым у „царскай хатцы" спадара Аляксандра. Можа гэтая крыху большая і цяжка цэлую нагрэць. Дзед Іван больш рухаецца. Пойдзе да суседкі, выйдзе за хату (бо таксама не мае прыбіральні). Выйдзе на вуліцу за пакупкамі.

— У гэтым годзе закрылі ў нас „гэзс". Прыязджае цяпер „самаход". Але гэтай зімой не заўсёды даязджае. Як засыпле дарогі, пакуль плугам праедуць, то ніхто не пераедзе. То „самаход" мае прапхнуцца? Дзе там! Купляем часам у запас, бо не знаеш ці даедзе той „самаход".

За сценкай

— Нам толькі так здаецца, што гэтая зіма такая страшная, — кажа Марк Масальскі, дырэктар Праваслаўнага асяродка міласэрнасці ELEOS Беластоцка-Гданскай епархіі. — Для людзей самотных, убогіх гэта час таксама цяжкі як і штогод.

Асяродак ELEOS вядзе ў зімовы час спецыяльную праграму „Акцыя зіма". У святліцы па вуліцы Варшаўскай у Беластоку бяздомныя ці самотныя людзі могуць атрымаць падставовую дапамогу ў гэты час.

— Працуе сталовая, каб патрабуючыя маглі з'есці цёплую страву, маем таксама свежую вопратку, шапкі, рукавіцы, бялізну — пералічвае Марк Масальскі. — Найчасцей просяць цёплай бялізны ды шапак і рукавіц, якія зімой неабходныя. Можна ў нас таксама пакупацца, чым карыстаюцца нашы падапечныя.

„Зіма як зіма, кожная нясе тыя ж самыя праблемы", — запэўнівае дырэктар і пераконвае, што ELEOS ведае, як дапамагаць у гэты час, бо і разумее патрэбы найбяднейшых.

— У нас, здаецца, няма нейкіх нечаканых ці складаных праблемаў, — шукаючы пацвярджэння сваіх слоў Тамара Баравік спаглядае на супрацоўніцу.

Кіраўнік Асяродка сацыяльнай дапамогі Гайнаўскай гміны Тамара Баравік глядзіць на сітуацыю вельмі станоўча:

— Калі прыходзіць зіма мы, зразумела, сочым за сітуацыяй нашых падапечных, але трэба сказаць, што большасць людзей, асабліва старых і самотных, вельмі добра рыхтуецца да зімы. Думаю, што жыццё навучыла іх самаарганізаванасці і патрэбы забяспечыць сябе. Намнога горш радзяць сабе малодшыя. Сапраўднай праблемай у нас з'яўляецца алкагалізм.

— Не, да нас гэтай зімой не прывозілі новых асоб, — кажа адна з апякунак Дома міласэрнасці „Самаранін" у Гайнаўцы, — маем сталых падапечных, а ў сувязі з зімой нейкіх акцый не праводзім.

Часцей патрабуючых можна сустрэць у хуткай дапамозе павятовых шпіталяў. Калі ёсць праблемы — найзручней старэнькага чалавека пакласці ў бальніцу. Неафіцыйна пра гэтую катэгорыю хворых гаворыцца: пацыент па сацыяльных прычынах. Нельга такога пацыента не прыняць у аддзяленне, бо было б гэта нялюдскім, паколькі ён у патрэбе. Аднак зіма тут не самая важная прычына, такія сітуацыі здараюцца круглы год. Аднак лёс старых людзей зімой як ніколі так непасрэдна залежыць ад законаў натуры.

* * *

Сяджу ў Асяродку сацыяльнай дапамогі ў Нараўцы. Маленькі, загружаны пакойчык. Побач мяне чарговая асоба падае заяву на апал, якога пачынае бракаваць.

— Прабачце, што ў нас такі балаган, не маем больш месца, — турбуецца Альжбета Патонец, кіраўнік Асяродка сацыяльнай дапамогі. — Маем шмат рэчаў, тут цацкі для дзяцей, тыя рэчы таксама трэба развезці. Шафаў не хапае, — усміхаецца.

Цяжкі зімовы перыяд адчуваюць не толькі людзі, але і сацыяльныя працаўнікі, якім часцей трэба перабівацца праз заснежаныя дарогі да сваіх падапечных.

— Ёсць такія месцы ў нашай гміне, да якіх складана дабрацца ва ўмовах так цяжкай зімы, — кажа Альжбета Патонец. — Па гэтай прычыне супрацоўнічаем з пагранічнікамі. Яны кантралююць сітуацыю ў месцах, да якіх часам немагчыма даехаць. Давозяць патрэбныя рэчы, прадукты, таксама апал. Заглядаюць тут штораз часцей людзі з просьбай дапамагчы з апалам. Дапамагаем як можам.

Так, як і ў Гайнаўскай гміне, праблемай Нараўчанскай гміны з'яўляецца алкагалізм.

— Аб'ядноўваем сілы, каб вырашаць тыя праблемы. Прабуем ствараць розныя сістэмы супрацоўніцтва мясцовых органаў, але ніколі няма так, што ёсць ахвота дапамагаць і зараз ужо праблемы знікаюць. На гэты момант перш за ўсё просім пагранічнікаў сачыць за асобамі, якія здаюцца быць пад уплывам алкаголю, бо пры нізкіх тэмпературах іх лёс можа быць вельмі сумны. Хочам пазбягаць трагедый.

Мароз і снег гэта зараз асноўныя ворагі жыхароў вёсак. Там у апошнюю чаргу даязджаюць снегаачышчальнік, крама з прадуктамі, сям'я, якая ў заснежаных гарадах таксама змагаецца са сваімі праблемамі.

— У гмінах не так лёгка дапамагаць як у большых гарадах. Там шмат розных фондаў, няўрадавых арганізацый, — дадае Альжбета Патонец. — Мы маем пару асоб і бюракратыю, якая забівае ахвоту да працы ды адначасова забірае нам большасць нашага часу. Так не павінна быць.

Зіма была, ёсць і будзе. З вякоў людзі сабе з ёю радзяць, а сістэма не паспявае за іхнімі праблемамі. У такі час найважнейшае, каб не забываць пра другога чалавека.

— Звоняць, часам звоняць, — на пытанне пра суседскую дапамогу адказваюць і ў Нараўцы, і ў Гайнаўцы. — Важнае, каб рэагавалі, але ведаем, што часам нават не клічуць службаў, а проста самі дапамагаюць старэйшым жыхарам, ці напаляць, ці расчысцяць панадворак. Сусед гэта вельмі важная ўстанова, — дадае Альжбета Патонец.

Як у большасці старых, самотных людзей няма ў хаце ні купальні, ні прыбіральні. Яго туалет — ацеплены, а нават, можна сказаць, прыаздоблены квяцістым матэрыялам — распаложаны ў пару кроках ад хаты.

Станоўчая ацэнка

Нарада, прысвечаная падвядзенню вынікаў працы паліцыі за мінулы год адбылася ў Гайнаўцы 20 студзеня. У пасяджэнні ўдзельнічалі намеснік ваяводскага каменданта паліцыі ў Беластоку інспектар Яцак Вальчак, павятовы камендант падінспектар Аркадыюш Бяляўскі, яго намеснік падінспектар Анеля Монах, кіраўнічы састаў павятовай камендатуры, раённы пракурор Люцына Сегень-Васілюк, віцэ-староста Ежы Сірак і віцэ-бурмістр Васіль Сцепанюк.

Асноўнай тэмай пасяджэння было абмеркаванне дзейнасці гайнаўскай паліцыі ў мінулым годзе. І так, больш за 83% апытаных жыхароў Гайнаўшчыны заявіла, што адчувае сябе бяспечнымі. Найбольш дакучлівымі пагрозамі і паталагічнымі з'явамі былі алкагалізм, бравурная язда на матацыклах і аўтамабілях, хуліганства і вандалізм, парушанне начной цішыні, насілле сярод малалетак і нецвярозасць вадзіцелей. Улічваючы заўвагі рэспандэнтаў кіраўніцтва Павятовай камендатуры прадугледжвае ў бягучым годзе перад усім прэвентыўныя дзеянні з мэтай выключэння заганных з'яў і паляпшэння бяспечнасці ды наладжання супрацоўніцтва з насельніцтвам. Падтрымку для такой дзейнасці прад'явілі прадстаўнікі самаўрадавых устаноў і раённай пракуратуры. Інспектар Яцак Вальчак канстатаваў у час выступлення, што функцыянеры гайнаўскай паліцыі заслугоўваюць станоўчай ацэнкі. Шмат цёплых слоў было сказаных і ад кіраўнікоў самаўрада.

У Гайнаўцы ў паліцыі нясуць службу 107 паліцэйскіх і 33 цывільныя працаўнікі.

Знішчальны агонь

Пачатак 2010 года на Гайнаўшчыне аказаўся няўдачлівым. Адно ў студзені пажарнікі з паліцыяй зарэгістравалі тры пажары. Агонь не толькі знішчыў гаспадарскую маёмасць, але пацярпелі ад яго і людзі.

6 студзеня пасля поўначы ўспыхнуў пажар у вёсцы Пасекі Нараўчанскай гміны. Пажарнікі ў час тушэння драўляна-мураванага будынка ў руінах знайшлі цела 47-гадовага гаспадара. Паліцыя высвятляе прычыну пажару і акалічнасці смерці мужчыны.

* * *

24 студзеня каля поўначы ўспыхнуў пажар у Дубінах Гайнаўскай гміны. Агонь знішчыў сярэдзіну кацельні і дах драўлянага будынка. Жыхары паспелі выратавацца. Як высветлілася, прычынай пажару было кароткае замыканне электраправодкі.

* * *

26 студзеня здарыўся чарговы пажар у вёсцы Соцы Нарваўскай гміны. Згарэў дах драўлянага будынка. Маці з сынам выратаваліся. Гэтым разам прычынай пажару (паводле вызначэння пажарнікаў) была няшчыльнасць канала коміна.

Справу пажараў высвятляе гайнаўская паліцыя.

Уладзімір СІДАРУК

Выбарчыя гайнаўскія тусоўкі

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Летам мінулага года пісаў я пра неабходнасць рамонту вуліцы Якуба Коласа ў Гайнаўцы. Па гэтай вуліцы знаходзяцца скейтпарк, гаражы, рынак і магазіны, між іншым, будаўнічых матэрыялаў. На гэтай вуліцы многа ямак. Пасля дажджоў побач магазінаў і ўезда на рынак з'яўляліся вялікія лужы і вадзіцелі баяліся, каб не паламаць аўтамабіля. Вуліца Якуба Коласа асабліва ажывае па серадах, калі працуе распаложаны ў яе суседстве адзін з гайнаўскіх рынкаў. У гэты дзень многа пакупнікоў наведвае магазіны будматэрыялаў. Матарызаваныя кліенты рынка ставяць машыны таксама і па вуліцы Якуба Коласа. Апошнім часам няроўнасці прыкрыў снег, але калі прыйдзе адліга, вады ў лужах будзе яшчэ больш. У беларускім асяроддзі здаўна гаварылася, што трэба асфальтаваць вуліцу, названую іменем беларускага пісьменніка, а радная ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта Вера Масайла вырашыла пагаварыць у гэтай справе з бурмістрам Анатолем Ахрыцюком.

Вуліца Якуба Коласа пасля дажджу. У гэтым годзе павінен тут з'явіцца асфальт

І на вуліцы Коласа рамонт будзе

29 снежня мінулага года на сесіі Рады горада разглядаўся праект бюджэту Гайнаўкі на 2010 год. У ім былі выдзелены грошы на мадэрнізацыю і асфальтаванне вуліцы Коласа. Аднак яшчэ да сесіі паявілася ідэя, каб гэтыя сродкі прызначыць на мадэрнізацыю і асфальтаванне вуліцы Генрыка Сянкевіча. Змена аргументавалася між іншым тым, што па вуліцы Коласа няма жылых дамоў. Покі яшчэ дайшло да галасавання над папраўкай да праекта бюджэту ў справе згаданых вуліц, радная ад Права і справядлівасці запрапанавала, каб сродкі прызначаныя на рамонт вуліцы Коласа выдаткаваць на мадэрнізацыю яшчэ іншай гайнаўскай вуліцы, але яе прапанова не разглядалася па фармальнай прычыне, паколькі трэба было яе прад'явіць прынамсі на два тыдні перад сесіяй. Прапанова прызначэння бюджэтных грошай на вуліцу Сянкевіча і адтэрмінаванне рамонту вуліцы Коласа была адкінута галасамі перш за ўсё радных Беларуска-народнага выбарчага камітэта і Самаўрадавай кааліцыі Гайнаўскага павета. У асноўным галасамі гэтых самых радных быў прыняты бюджэт Гайнаўкі на 2010 год, з указаннем выдаткавання звыш двухсот тысяч злотых на рамонт вуліцы Коласа. Прадстаўнікі магістрата будуць яшчэ весці размовы з гайнаўскімі прадпрымальнікамі, якія маюць свае магазіны па гэтай вуліцы, каб тыя далажыліся на рамонту. Бурмістр Анатоль Ахрыцюк заявіў, што толькі пасля ўплачэння грошай прадпрымальнікамі будуць распачаты працэдуры ў справе рамантавання вуліцы Коласа.

Ці распачаліся ўжо перадвыбарчыя тусоўкі?

Прыслухваючыся дыскусіі перад прысваеннем гайнаўскім вуліцам імён Якуба Коласа і Янкі Купалы ўзнікала пытанне: чаму гайнаўскія радныя, прадстаўнікі правых груповак, не падтрымліваюць ідэі ўшанавання беларускіх пісьменнікаў? Перад тым, як была ўведзена беларуская мова ў якасці дапаможнай для зносін гайнавян з гарадскімі чыноўнікамі, можна было пачуць таксама многа контраргументаў супраць гэтай ідэі беларускіх радных. Адмоўна ацанялі яе радныя ад Права і справядлівасці, Грамадзянскай платформы і некаторыя радныя ад Самаўрадавага паразумення Гайнаўскага павета. У гэтым годзе адбудуцца чарговыя самаўрадавыя выбары і калі б прадстаўнікі ад Грамадзянскай платформы або Права і справядлівасці хацелі ў будучай Радзе горада збудаваць правячую кааліцыю, павінны ўжо цяпер здабываць давер прынамсі радных ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта, а гэтага не відаць. Мала ж праўдападобнае, каб у будучай гайнаўскай радзе радныя ад ГП ці ПіС змаглі самастойна здабыць большасць мандатаў, а ведаем з іншых гарадоў, што гэтым партыям таксама цяжка паразумецца паміж сабой. Хаця ў цяперашняй Радзе горада Гайнаўкі дзейнічае кааліцыя паміж Беларуска-народным выбарчым камітэтам і Самаўрадавым паразуменнем Гайнаўскага павета, збудаваным на базе ранейшага выбарчага камітэта СЛД, то адкрытым застаецца пытанне наконт правячай кааліцыі ў будучай радзе, хаця б пасля спекуляцый наконт кандыдатаў на пасаду бурмістра Гайнаўкі.

У гайнаўскім дадатку да штодзённі „Кур'ер паранны" паявіўся артыкул, у якім былі прадстаўлены сенсацыйныя, як на гайнаўскія ўмовы, інфармацыі. Паведамлялася ў ім, што ў сёлетніх выбарах кандыдатам на бурмістра Гайнаўкі, якога падтрымае Грамадзянская платформа, можа быць цяперашні бурмістр Анатоль Ахрыцюк. Паводле аўтаркі артыкула, намеснікам бурмістра Гайнаўкі мог бы стаць член гайнаўскай структуры ГП. Журналістка спекулявала таксама, што ад СЛД кандыдатам на бурмістра мог бы быць сённяшні намеснік гайнаўскага старасты Ежы Сірак, а трэцім кандыдатам мог бы стаць старшыня ўправы Жыллёвага кааператыва ў Гайнаўцы Міраслаў Мордань. Пазней паявіліся спекуляцыі, што сённяшняга бурмістра мела б падтрымаць у выбарах таксама ПСЛ, якое ішло б да самаўрадавай гонкі разам з ГП. Гэтых спекуляцый не пацвярджаюць самі іх героі, а самаўрадавыя дзеячы па-рознаму ацэньваюць гэты сцэнарый.

— Можа быць так, што ў сёлетніх выбарах бурмістр Анатоль Ахрыцюк атрымае падтрымку ад ГП. Аднак Ежы Сірак хіба не стане змагацца за кіруючую ў Гайнаўцы пасаду з правячым бурмістрам і мала праўдападобнымі з'яўляюцца спекуляцыі, што са згаданымі асобамі стане спаборнічаць у выбарчай кампаніі Міраслаў Мордань, — заявіў прадстаўнік Беларуска-народнага выбарчага камітэта з Гайнаўкі, у якім канкрэтна не разважалася яшчэ справа падтрымкі для кандыдата на бурмістра.

Аўтарка артыкула ў „Кур'еры паранным" паведаміла мне, што, пішучы тэкст, карысталася выказваннямі канкрэтных асоб зацікаўленых самаўрадавай дзейнасцю, а ў сваю чаргу я ўспомніў, як у час выбарчай кампаніі ў Еўрапарламент дэпутат Сейма ад ГП Роберт Тышкевіч моцна хваліў бурмістра Анатоля Ахрыцюка за кемлівасць.

— У сённяшняй рэчаіснасці ўсё магчымае, — сказаў адзін з маіх суразмоўцаў.

Калі пачаліся спекуляцыі наконт кандыдатаў на пасаду бурмістра Гайнаўкі, значыць што ўжо пачалася перадвыбарчая тусоўка ў партыях і выбарчых камітэтах. Падобныя разважанні пэўна вядуцца і ў гмінах, але з кандыдатамі ад канкрэтных выбарчых камітэтаў і партый будзем маглі пазнаёміцца не хутчэй як летам. У час восеньскіх перадвыбарчых сустрэч у нашых гмінах будзе добрая нагода, каб спытаць кандыдатаў на войтаў, бурмістраў і радных наконт іх стаўлення да розных мясцовых праблем, у тым ліку і да нашых беларускіх спраў. Будзе магчымасць даведацца як асобы, што будуць змагацца за нашы галасы, ставяцца да двухмоўных указальнікаў на польскай і беларускай мовах, аб чым многа пісалася і гаварылася. Прыемна было б таксама глянуць на гайнаўскія вулічныя шыльдачкі з назвамі па-беларуску: „вул. Янкі Купалы" і „вул. Якуба Коласа".

Сталяр-мастак з Орлі

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Занікае прафесія сталяра ў нашых вёсках. Сучаснае сталярства вельмі розніцца ад ранейшага, але ў Орлі працуе яшчэ спецыяліст, які карыстаецца толькі традыцыйнымі, вельмі трывалымі метадамі апрацоўкі драўніны.

Уладзімір Война нарадзіўся ў 1943 годзе, шмат гадоў жыў у Беластоку, а на пенсію з'ехаў у родную Орлю. Закончыў ён сталярскую школу ў Алецку па спецыяльнасці мастацкі сталяр; цікава тое, што такую спецыяльнасць атрымалі толькі два вучні тагачаснага ягонага класа. Таму і сёння ён захапляе мясцовых людзей сваімі прыгожымі вырабамі.

Уладзімір Война кладзе палітуру на ўласнаручна выкананы стол

Спадар Уладзімір, хаця шчыры ў адносінах з людзьмі, не любіць расказваць пра сябе. Мажны былы спартсмен, прытым уражлівы — любіць прыроду, разводзіць каляровых птушак. Ягоныя галубы пераадолелі тысячы кіламетраў каб вярнуцца ў сваё арлянскае гняздо, а драўляныя вырабы мастака адпраўляліся ў вырай у далёкі свет.

— Ваша праца, кожны Ваш выраб, захапляе людзей; укладаеце ў гэта цэлы свой талент...

— Здараецца, што і людзі задзіўляюць мяне. Вось, акурат, вырэзваў я фігуру Ісуса, амаль у чалавечы рост, яшчэ не завяршыў. А прыйшла вясковая жанчына, якая тую фігуру заказала, пабачыла, і перажагналася. А я гэта ўшанаваў.

Драўляных фігур распятага, нават у чалавечы рост, Хрыста выразаў я хіба за сотню, яны знаходзяцца ў храмах. На тыя рэзьбы сам накладаў паліхромію, каб тая драўляная постаць мела выгляд чалавечага цела. Рабіць тэкстуру слаёў вучылі нас у школе. Калісь жа не было ламінатаў і стальніцу трэба было памаляваць адпаведным чынам. Найперш шпаклявалі замазкай, пасля на воцаце разводзілі вохравую фарбу, малявалі драўнінападобныя пласты і гэта крылі лакам. Ламінаты паявіліся ў нас тады, калі я канчаў у 1962 годзе школу. Гаварылі тады мне: Нідзе не атрымаеш працы, бо ўсюды ламінаты ўводзяць, якія жанчыны выконваюць. На стружкавы панэль кладуць паперу з воскам і нагнятаюць пад высокай тэмпературай. Аднак працы мне не бракуе.

— Вашы шыкоўныя драўляныя мэблевыя вырабы знайшлі прызнанне ў цэлай Еўропе, і нават у Канадзе. Што Вы можаце сказаць пра захапленне сваёй прафесіяй — сталярствам?

— Сталярскія вырабы майго дызайну могуць быць рассеяны па цэлым свеце. Здаралася, што я нават не ведаў сваіх замежных атрымальнікаў. Да таго ж, такія ўнікальныя вырабы маглі мяняць уладальнікаў. Я меў сваю майстэрню ў Беластоку па вуліцы Марчукоўскай. Вырабляў шыкоўную мэблю, пачынаючы ад ложкаў да найменшай шафкі, аўтарскія копіі старадаўніх прадметаў, гадзіннікаў; на працягу сарака пяці гадоў давялося ўсё рабіць.

Цяперашнія майстры не ведаюць колішняга сталярства, у якім было мала клею, а ўсё злучалі пазамі. Я вучыўся дакладна — ад асноў — мастацтву працы ў драўніне і сам запраектую, бо гэтую ўмеласць таксама трэба засвоіць. І ўмею выканаць свой праект — мэблю ці будынак. Зараз драўляныя канструкцыі злучаецца найчасцей шрубамі і бляхай, бо гэта адбываецца хутчэй чым традыцыйнымі метадамі; і хутчэй гэта выходзіць са строю.

У час апрацоўкі праваслаўнага крыжа

Калі я працаваў у Аўстрыі — рабіў там дварок адной жанчыне, то гаварылі тады мне, што ў Аўстрыі сталяры з маімі ўмеласцямі павыміралі там ужо сто гадоў раней. Бо колішняя мэбля быццам размаўляла з чалавекам. А гэта таму, што яе пакрывалі не лакам, але палітурай, да якой вельмі прыемна дакранацца і яна прыемна пахне. А сучасную мэблю заліваюць лакамі, з-пад якіх не відаць сітавінкі. Калісь, калі прымянялі палітуру, то грунтавалі алівай, памаксам замазвалі поры і тады атрымлівалася вельмі гладкая паверхня; так, напрыклад, вырабляюць фартэпіяна, бо яны выносяць гукі. Мой выкладчык, Станіслаў Малашко, рабіў менавіта фартэпіяна.

— На пенсію з'ехалі Вы з Беластока ў родную Орлю. Вашы мастацкія ўмеласці апрацоўкі драўніны цікавяць мясцовую моладзь, а мінулым летам вялі Вы з ёю майстар-класы, ладжаныя нашым Гмінным асяродкам культуры. Спытаю пра Вашых дзяцей: якім жыццёвым шляхам яны пайшлі? Прыдаўся б у сям'і Ваш наследнік...

— Мае дзеці ўнаследавалі мае здольнасці. Дачка Аня, навуковы працаўнік універсітэта, спецыяліст па псіхалогіі і педагогіцы, умее апрацоўваць драўніну, разьбярыць, малюе. Старэйшы сын Пётр хацеў заняцца маёй справай, але, улічваючы парок зроку, не прынялі яго ў такую школу і ён завяршыў малочны тэхнікум, а далей штудзіраваў архітэктуру і стаў архітэктарам. А малодшы сын Конрад закончыў прафтэхвучылішча, а пасля драўляны тэхнікум у Беластоку. Разам з ім рабілі мы ў Беластоку дахавыя каркасы, мэблю, копіі гадзіннікаў. Пасля пераехалі ў Орлю і хацелі на бацькоўскім панадворку зрабіць майстэрню. І два сыны пабудавалі тут вялікі драўляны будынак, а я толькі „дырыжыраваў". І Конрад меў быць маім наследнікам, але 13 жніўня 2005 года трагічна згінуў, пражыўшы толькі дваццаць пяць гадоў. Ехаў на матацыкле па вуліцы Берлінга ў Беластоку, а таксіст выехаў з вуліцы Гаёвай з-за аўтобуса. Сын меў першынство, але таксісты вечна спяшаюцца... Страту сына вельмі мы, з жонкай Вандай, перажываем. А меў быць маім наследнікам... — канчае сумна мой суразмоўца.

Дорага, ды без болю

Варыкоз вен — гэта хвароба ног, якую ў нас звычайна называюць „жылякамі". У шпіталях традыцыйна лечаць варыкоз аперацыйна. Цяпер з'явіўся новы спосаб лячэння „жылякаў" з дапамогай уколаў.

У Гайнаўцы ўколамі і без болю лечыць ногі доктар Андрэй Папоў у прыватным кабінеце па вуліцы 3 Мая. Пасля ўколаў ногі ўкручваюць бінтом „Matokrep" і рэкамендуюць многа хадзіць. Да гайнаўскага спецыяліста прыязджаюць людзі з усяго ваяводства і нават з усёй Польшчы. Пацыенты хваляць такі спосаб лячэння. Уколы супраць варыкозу дарагія. Адна лекарская працэдура разам з бінтом каштуе каля 500 злотых, а каб вылечыцца, трэба зрабіць некалькі візітаў. Не ўсім гэта па кішэні, але пацыентаў у доктара шмат. Падобна можна лячыць ногі таксама ў Бельску-Падляшскім па вуліцы Круткай.

Зіма не жартуе

У гэтым годзе зіма цяжкая — снежная і марозная. Слупак тэрмометра апускаецца да мінус 30 градусаў. Пры такіх нізкіх тэмпературах нялёгка нагрэць вясковую хату. Трэба ўвесь час памятаць аб асцярожнасці з агнём і аб тым, каб лішне не напівацца ў час святкаванняў.

У Пасеках каля Семяноўкі ў пажары загінуў 47-гадовы мужчына. Быўшы п'яным, распаліў ён у печы, не зачыніў дзверцаў і заснуў... назаўсёды. Ад іскраў загарэлася хата і згарэў гаспадар. Падобна было год таму ў Масеве, дзе пасля святкаванняў у агні загінулі муж і жонка. Гэта прыклады з адной, Нараўчанскай гміны. Колькі такіх няшчасных выпадкаў у Польшчы і ў свеце? Колькі паламаных рук і ног? У Гайнаўцы хлопец пакаўзнуўся, нешчасліва ўпаў ды забіўся. Не забывайма зімой аб асцярожнасці, бо зіма не жартуе!

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

У вёсках меншае дрэў

Каб захапляцца прыгажосцю дрэў, зараз трэба ісці ў лес або ў парк. У нашых вёсках засталіся толькі рэдкія экземпляры прыгожых дрэў. А яшчэ за маёй памяці (мне 65 гадоў) паабапал вясковых вуліц раслі стройныя вязы, ліпы, ясені, бярозы ды каштаны. А як цяпер?

Дык вось стаяць слупы вулічнага асвятлення і дзеля іх дрэвы калечаць — ссякаюць верхавіны або галіны. І дрэвы стаяць брыдкія, з куксамі. Электралінія мае перавагу над дрэвамі і калі бяжыць праз вёску, і калі бяжыць праз лес.

Ажно прыкра глядзець на дрэвы-чучалы побач вуліц. Так ёсць у Старым Ляўкове і ў Нараўцы, дзе амаль усе дрэвы высеклі. У гэтых вёсках „скасавалі" шмат ліпаў калі будавалі тратуары. Заміналі тыя дрэвы, што раслі блізка маставых на абочынах вуліц. Іх вырвалі з пнямі. Так ужо ёсць, калі хочам пашырыць вуліцу ці дарогу. Тады на дрэвы ніхто не зважае.

Вось таму ў вёсках усё менш дрэў. А хто ў вёсках бачыў парк? Мо толькі ў Новым Ляўкове знайшоўся такі гаспадар? Ён мае не абы-які бярэзнік, ды ў ім ужо грыбы растуць! Вось любіцель прыроды! **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Масленка, Запусты, Валянцінкі!

Калі вуліцамі Рыо-дэ-Жанейра будуць ісці карнавальныя карагоды, мы не павінны зайздросціць. У нас сваё свята: Масленіца. Гэтае свята зараз называюць Запустамі, якія пачынаюцца ў апошні чацвер перад Вялікім постам. Запусты спраўляюць яшчэ тры дні, аж да панядзелка. У гэты час ладзяць танцы і ўсялякія забавы, куліг і зімовы гульні. У старажытныя часы Масленіцу спраўлялі аж два тыдні. Абрад адзначалі на зломе месяцаў: у апошні тыдзень лютага і першы сакавіка. У першы тыдзень ішло вясёлае развітанне з зімой, пасля віталі вясну (народная прымаўка: *А ў нас Масленка, прыляцела ластаўка!*). Абрадам прыпісваліся спецыяльныя дыеты. Паколькі ў першы тыдзень спажывалі мясныя і тлустыя стравы, то ў другі першынство належала малочным стравам: маслу, сыру, малаку. У гэты перыяд таксама гурбамі выпякалі бліны, пончыкі, хрусты (адтуль звычай есці пончыкі ў тлусты чацвер). Пра мясна-малочны характар абрадаў напамінаюць іх старажытныя назвы. Першы мясны тыдзень яшчэ па наш дзень старажылы завуць *Мэсніцы*, другі — *Масленая* або з царкоўнага *Сырапусная сядміца*. Такі арыгінальны раздзел у кулінарыі меў сваё апраўданне ў прыродзе. Якраз у пачатку сакавіка ў сялян пачынаўся акот і ацёл жывіны, у сувязі з чым у гасцяпадарцы былі лішкі малака.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Фота Міры ЛУКШЫ

Бабуля Марыя Якімюк з „Чыжавянаў" з унучкай Юляй Іванюк

У час Масленкі масава спраўлялі вяселлі. Нашы продкі верылі, што такім чынам паўплываюць на будучы ўраджай: карацей, калі ў вёсцы было больш вяселляў, тады і ўраджай меў быць багацейшы. У Масленіцу па вёсцы хадзілі калядоўшчыкі. Першае месца тут прыпадала дзяўчатам і маладым замужнім жанчынам. Яны пераапраналіся ў маскі і чужаземныя строі ды хадзілі па хатах, дзе жылі халастыя хлапцы і незамужнія дзяўчаты. Для тых, хто не хацеў выходзіць замуж або жаніцца, калядоўшчыкі спявалі магічныя песні, прыдумвалі смешныя вершыкі. Усё, што зрабілі і сказалі, мела паспрыяць замужжу. Узамен „абдараваныя" мелі пачаставаць сырам і макам...

У гэты раз Масленіцы разам з Валянцінкамі. Трэба вам ведаць што і ў нас была падобная звычка прызнавацца ў каханні. Абрад быў прыпісаны якраз Масленіцам. На вечарынах, дзе сустракалася моладзь, хлапец прышпільваў да спіны дзяўчыны чырвоную стужку. Усё адбывалася ў атмасферы сакрэтнасці. Дзяўчына не магла бачыць хто прыаздобіў яе чырвонай стужкай, а яна сама павінна была здагадацца хто гэта такі зрабіў... Вось, такія гульні, такія звычаі!

ЗОРКА

Тацяна Бушко

Сняжынка

Выбегла Тацянка з дому. Снег мяккі сыпле, усцілае зямлю. Выцягнула ручкі ў сініх рукавічках. На іх зоркі-сняжынкі — мама вышывала. Але вось жа і яшчэ сняжынка прыбавілася. Сняжынка сапраўдная. Яна маленькая, куды меншая за вышываную. Толькі што гэта? Яна яшчэ меншая робіцца. Глядзіць на рукавічку Тацянка, а сняжынка ўсё меншае і меншае. Раптам зусім прапала. Дзе ж яна падзелася? Тацянка перавярнула руку — і тут няма!

Тым часам на далоньку апусцілася яшчэ адна сняжынка. Вялікая, пушыстая.

«Ну, цяпер я разумнейшая буду»,— падумала Тацянка. Сціснула яна сняжынку ў рукавічцы і дадому хутчэй пабегла — маме паказаць. Вельмі ўжо гэтая сняжынка да мамінай вышыванай падобная.

— Мама, зірні, што я прынесла! — і выпрастала руку. А на далоні зноў нічога няма! Заплакала Тацянка ад крыўды.

— І куды яна падзелася? — плача Тацянка.

— Хто? — пытаецца мама.

— Сняжынка! Я табе яе ў рукавічцы прынесці хацела. Несла, несла і згубіла па дарозе!

— Не плач! Не згубіла ты яе... — і мама расказала Тацянцы, што здарылася са сняжынкай.

А вы здагадаліся, дзе падзелася сняжынка?

Рыгор Барадулін

Загадкі на градках

От бабуля важна села
І глядзіць навокал смела.
У зямлю схавала лапаць.
Як зачэпіш — будзеш плакаць.
Гэта злосная бабуля Называецца...
(цыбуля)

У бабулі родны брат
Ласкавейшы быццам,
А да слёз давесці рад,
Так, як і сястрыца.
Сам сабе наўме панок,
А прасцей сказаць... *(часнок)*

З вусамі,
А не стары.
Зайздросныя вочы.
За што-небудзь на двары
Учапіцца хоча.
Хопіць хітрасці на трох,
Ну, на тое ж ён... *(гарох)*

Не сыдзе з месца
Ні на крок,
Зарыўшыся ў пярыну.
Цярэбіць ціхі вецярок
Ягоную чупрыну.
А возьмуць за чупрыну
Ды выцягнуць з пярыны —
Пачырванее, нібы рак.
Вядома, хто гэта... *(бурак)*

Алесь РАЗАНАЎ

СКАРБ

З зямлі выкопваюць скарб — гаршчок старажытных рымскіх дынараў.

Ніхто не ведае, як яны апынуліся тут, у гэтай паўночнай, далёкай ад Рыма, краіне, хто іх калі сабраў, хто іх калі, баючыся за іх, закапаў...

Калісьці яны валодалі дзейснаю моцай — рушылі войскі, узводзілі гарады, чынілі прысуды, аднак і цяпер...

Яны сцярожка кранаюцца нашых рук, кранаюцца нашых душаў і ў нас ажываюць паволі нам не знаёмыя вобразы, нам не вядомыя з'явы,
і мы, здзіўляючыся, разумеем, што мы гэтаксама зямля, што мы гэтаксама зямля, у якой схаваны нечыя скарбы.

Святая гара Грабарка

Хіба няма на Беласточчыне чалавека, які не ведаў бы дзе знаходзіцца святая гара Грабарка — самы важны праваслаўны санктуарый на Падляшшы і ва усёй Польшчы. Штогод, на свята Праабражэння Гасподняга прыбываюць сюды сотні вернікаў, якія нясуць з сабой абракальныя крыжы. Але паколькі амаль усе ведаюць сённяшнюю Грабарку, нямногія чулі пра яе гісторыю.

У гэтым годзе адзначаецца трохсотая гадавіна з першага цуду, які здарыўся на святой гары. У 1710 годзе падчас эпідэміі халеры, у выніку якой памерлі тысячы жыхароў паўднёвага Падляшша, пажылому жыхару Сямятыч прыснілася, што дзеля аховы перад хваробай людзі павінны пайсці на гару Грабарку. Пасля прыбыцця на гару і ўсталявання абракальнага крыжа людзі пачалі здаравець. Нейкі час пасля на святой гары з'явіліся тысячы жыхароў з усяго наваколля. Гаворыцца, што ўлетку 1710 года на святой гары Грабарцы з'явілася каля 10 тысяч вернікаў. Яшчэ ў гэтым самым годзе на Грабарцы ўсталявалі драўляную капліцку. У чарговыя гады і стагоддзі гара была мэтай шматлікіх паломніцтваў.

Сёння на Грабарцы знаходзіцца праваслаўны жаночы манастыр св. св. Марты і Марыі. Паўстаў ён у 1947 годзе. Першымі манашкамі, якія засялілі Грабарку, былі тыя, якіх ранейшыя манастыры былі закрыты або апынуліся па-за межамі Польшчы.

Страшным момантам у гісторыі Грабаркі быў 1990 год, калі жыхар адной з навакольных вёсак падпаліў царкву з канца XIX стагоддзя. Аднак дзякуючы намаганням манашак, царкоўных улад і вернікаў на месцы старой пабудавалі новую царкву, якая была асвечана ў 1998 годзе.

Падчас свята Праабражэння Гасподняга Грабарка напаўняецца тысячамі вернікаў з усёй Польшчы. Але каб фактычна пачуць атмасферу гэтага месца, варта прыехаць сюды ў іншы дзень. Тады інакш можна глянуць на царкву, крыжы вакол яе, якія прынеслі паломнікі, ды на чароўныя дрэвы, якія акружаюць святыню. Тады можна больш асабіста адчуць адметнасць гэтага месца, якое славіцца сваёй святасцю ўжо 300 гадоў.

Міхась СЦЕПАНЮК

Музыка з кайфам

Стары новы сябра

Неўзабаве споўніцца дзесяць гадоў з моманту, калі разышоўся адзін з важнейшых альтэрнатыўных беларускіх гуртоў 1990-х гадоў. Доўгі і складаны сказ, але ўжо неактуальны. А гэта таму, што пасля доўгага перапынку музыкі гурту „Hasta la Fillsta" вырашылі вярнуцца да супольнай працы. Хаця Хрысця Мендзялеева, якой голас быў візіткай гэтага менскага гурту, зараз жыве ў Бельгіі, то, паводле музыкаў, застаецца з імі сэрцам ды новымі ідэямі гурту. Што думае яна наконт новай вакалісткі? Варта было б спытаць яе пры нейкай нагодзе, бо новы голас „Hasta la Fillsta" ўжо добра вядомы беларускім слухачам. Воля Самусік нясмела пачынала ў гурце „Жыгімонт Ваза", пасля замяніла вельмі характэрную і, здаецца, паважаную Свету Сугаку з „Тарпача", каб з „Тарпача" зысці і знянацку апынуцца ў аднаўленым гурце.

Як справа маецца з тымі зыходамі і пераходамі, ведаюць толькі самі музыкі. На сваім прыкладзе ведаю, што калі знікае з гурту важны яго сябра, не заўсёды жыццё гурту завяршаецца, але напэўна змяняецца. Зыход бубнача гурту „Таварыш Маўзэр" пачаў аднак яго канец. Бывае па-розному і часам нават не прадбачыш эфектаў. Мы, як слухачы, часта прыкаем да сваіх куміраў і хаця музыка часам не мяняецца, то ў выпадку змены вакаліста ці вакалісткі бываем проста пад уплывам вялікага шоку. Шок у музыцы часам бывае неабходны, аднак у месцы шоку часцей застаецца жаль. Хаця ў выпадку гурту „Нейра Дзюбель" лідарам з'яўляецца безумоўна Аляксандр Кулінковіч, то калі яго сцэнічны сябра, бэк-вакаліст, пяшчотна званы „Паскудай" зышоў з гурту, сцэна падалася крыху пуставатай. Шчасліва для ўсіх вярнуўся ён у саставу музыкантаў і зараз паспяхова выступаюць у дуэце.

Не ведаю ці Вольга Самусік спрычыніцца да буйнога развіцця і папулярнасці „Hasta la Fillsta", але, як кажуць музыкі, не будзе так, што гурт ярка здамінуе цяпер рок-вакалістка. Будзе ісці проста творчы абмен. А творчы абмен між людзьмі ў музыцы гэта асноўнае.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 7

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 3:

Рысь, сок, апарат, маразы, зіма, банк, як, амяла. Зад, спамін, рамка, пара, сіта, ял, калыска.

Узнагароды, кашулькі са знакам Радыё „Рацыя", выйгралі **Юліта Данільчук, Міраслава Дзмітрук, Эва Аярчук, Віялета Дработа, Кацярына Дзержаноўская** з Бельска-Падляшскага, **Якуб Назарук** з Гайнаўкі, **Рафал Вакулюк** з Арэшкава, **Агнешка Анішчук, Наталля Тарасюк** з Дубін. Віншуем!



Беларуская песня ў тэатры

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

XVII Агульнапольскі фестываль беларускай песні завяршыўся 7 лютага гала-канцэртам у беластоцкім Драмтэатры імя Аляксандра Вянгеркі. На жаль, у вялікую глядзельную залу тэатра змяшчаецца ў шмат разоў менш гледачоў, чым у адзінай на ўсю сталіцу ваяводства залу пад дахам, дзе праводзіліся фестывальныя гала-канцэрты, і цана білетаў была немалая. Сабраліся шчырыя паклоннікі роднай песні, каб урачыста адслухаць найлепшых выканаўцаў падляшскай беларускай песні. Шмат было гасцей — ад дыпламатаў, палітыкаў і самаўрадаўцаў рознага рангу з Польшчы і Беларусі, святароў да грамадскіх актывістаў. Адчытаны былі віншавальныя лісты між іншым ад урада Рэспублікі Беларусь і мітрапаліта Савы. Усе адзначалі важкасць нашай тут руплівай беларушчыны і багацце музыкі. Сапраўды, святочнае атачэнне і дух высокай культуры, які лунае ў шаноўных тэатральных мурах, да таго знакамітая акустыка паспрыялі таму, што канцэрт быў проста асалодай таксама і для найбольшых рупліўцаў на роднай ніве — выступоўцаў. Шкада, аднак, як адзначыў Сяргей Лукашук з „Маланкі", што няма ў Беластоку адпаведнай залы для такіх вялікіх канцэртаў, бо саміх мастакоў было пад чатырыста асоб, і было ім і іх адмысловым народным строям вельмі цесна ў гардэробах. А „Маланка" і беластоцкая „Калінка" выступілі ў новых, казачна каляровых, пашытых для іх спецыяльна ў Беларусі народных строях. Беластоцкая „Калінка" таксама дзякуючы новаму колеру — макавачырвонаму — урэшце перастане асацыявацца са сваёй карэннай залучанскай (у ёй выступае адна спявачка са „старое" „Калінкі") і пойдзе на поўную эстраду (I месца). Залучанская „Калінка", свежая і бадзёрая, запамятаная сваім жэстам і рухам, выступіла таксама з поспехам (II месца як вакальны ансамбль). Дарэчы, не толькі журы чуе, дзе выступаюць з плэйбэка, а дзе сапраўды іграюць, як яшчэ, скажам, у „Нарве", „Хутары" ці „Арт-Пронары". У XVII фестывалі першыя месцы ў пятнаццаці катэгорыях узяло 18 выступаючых адзінак. На гала-канцэрт быў запрошаны між іншым таксама дэбютант — калектыў „Луна" з Парцава (тут спяваюць жанчыны і мужчыны з Парцава і Галадоў, а працуе ён з Міхасём Аўхіменем). Каб было справядліва, варта ўспомніць не толькі лаўрэатаў першых месцаў. У катэгорыі **фальклорнай аўтэнтычнай песні** перамагла Марыя Врублеўская з Гарадка (спеў а капэла паказаў усе яе вакальныя магчымасці), II месца заняла Вера Нічыпарук з Маліннік, III — Вольга Ахрымюк з Чыжоў і Іаанна Чабан з Крынак. У дуэтах, тэрцэтах і квартэтах на I месцы апынуўся квартэт „Жэмэрва" са Студзівод, на II — дуэт Галена Датчук і Іаланта Кендысь з Машчонай-Каралеўскай, на III — квартэт „Малінкі" з Маліннік. Сярод вакальных калектываў на I месцы — ансамбль „Жэмэрва" са Студзівод, на III — калектыў „Згодныя макі" з Райска і калектыў „Журавінкі" з Агароднічак. Сярод хароў перамагла „Родына" з Дубяжына. У катэгорыі **фальклорнай апрацаванай песні** сярод салістаў перамагла Крыстына Сульжыцкая з Варшавы. II месца — Рэната Тушынская з Гайнаўскага белліцэя і Юры Карпюк са Старога Ляўкова. III месца — Ніна Шыманская з Орлі. Вылучэнне — Мікалай Іванчук з Бельска-Падляшскага. У дуэтах, трыо і квартэтах I месца заняў мужчынскі квартэт „Чыжавян" з Чыжоў, II — квартэт з Белавежы, квартэт „Васілёчкаў" з Бельска-Падляшскага, III — трыо з Козлікаў, вылучэнне — квартэт „Арлян" з Орлі. Сярод вакальных калектываў: I месца — калектыў настаўніц з Садка № 14 у Беластоку і калектыў „Сугучча" з Крынак, II — калектыў „Цаглінкі" са Старога Ляўкова, калектыў „Луна" з Парцава, III — мужчынская група „Крыніцы" з Беластока. Вылучэнне — „Незабудкі" з Нурца-Станцыі, „Асенні ліст" з Гарадка. Вакальна-інструментальныя калектывы: I месца — калектыў „Вэрвочкі" з Орлі, III месца — гурт „Дэкадабанд" з Бельска-Падляшскага. Эстрадныя калектывы: I месца — калектыў „Знічка" з Гайнаўскага белліцэя. Хары: I месца — „Загадка" з Супрасля, II месца — „Клекацякі" з Боцек, III месца — „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага. У катэгорыі **сучаснай песні** сярод салістаў I месца атрымалі Дар'я Маркевіч з Гайнаўскага белліцэя і Уладзімір Іванюк з Беластока, II месца — Марта Маліноўская з Бельска-Падляшскага, III месца — Марта Адамюк з Гайнаўкі, вылучэнне — Моніка Сухадола са Старога Ляўкова і Валянціна Арэшук з Орлі. У дуэтах, трыо і квартэтах: II месца — дуэт Люба Гаўрылюк і Ала Каменская з Козлік, III месца — дуэт Ніна Шыманская і Яўгенія Хмялеўская з Орлі, жаночы квартэт „Чыжавян" з Чыжоў. Вакальныя калектывы: I месца — ансамбль „Куранты" з Бельска-Падляшскага, „Расспяваны Гарадок" з Гарадка. II месца — калектыў „Рамонка" з Ласінкі, „Дзявочыя ноткі" з Бельска-Падляшскага, калектыў „Калінка" з Залук, „Чыжавяне" з Чыжоў. III месца — жаночая група „Крыніцы" з Беластока, дзявочая група „Каласкоў" з Беластока, жаночая група „Рэха пушчы" з Гайнаўкі. Вылучэнне: калектыў „Рэчанька" з Козлікаў, жаночая група „Васілёчкаў" з Бельска-Падляшскага. Эстрадныя калектывы: I месца — ансамбль „Калінка" з Беластока. Вакальна-інструментальныя калектывы: I месца — „Маланка" з Бельска-Падляшскага, II месца — „Арт-Пронар" з Нарвы, мужчынская група „Маланкі" з Бельска-Падляшскага, III месца — капэла „Хутар" з Гарадка, гурт „Нарва" з Нарвы. Хары: I месца — „Крыніца" з Беластока", II месца — „Каласкі" з Беластока, III месца — „Рэха пушчы" з Гайнаўкі.

На завяршэнне гала-канцэрта выступіла фальклорная група „Купалінка" пад кіраўніцтвам Алены Цялковай з мінскай Дзяржаўнай філармоніі.

„Сугучча" з Крынак

„Жэмэрва" са Студзівод

„Чыжавяне" з Чыжоў

Родам з Беласточчыны

Артымовічы

Сяргей ЧЫГРЫН

Сёння я хачу расказаць пра знакамітых беларусаў з Беласточчыны Віктара, Адама і Антона Артымовічаў, якія ў XIX стагоддзі ўнеслі вялікі ўклад у эканамічнае развіццё Расійскай імперыі. На жаль, што не сваёй уласнай Бацькаўшчыны, а менавіта Расійскай імперыі. І гэта не іх віна, а бяда. Бо, як мы ведаем з гісторыі, беларускае гаспадарства было зліквідавана ў канцы XVIII стагоддзя. Да гэтага спрычыніліся нашы як заходнія, гэтак і ўсходнія суседзі.

Увесну 1791 г. у часе Вальнага Сейма польскія магнаты і апалячаная беларуская шляхта, імкнучыся ўмацаваць Польшчу, над якой навісла пагроза з боку Аўстрыі, Прусіі і Расіі, заявілі пра неабходнасць увядзення спадчыннай манархіі і зліквідавання адметных дзяржаўных структур Вялікага Княства. Так здзейснілася шматвяковая мара нашых заходніх суседзяў. Беларускае гаспадарства з гэтага моманту дэ-юрэ ўвайшло ў склад Польшчы. Праўда, ненадоўга. У траўні 1792 г. расійская армія пад камандаваннем Міхаіла Крачэтнікава захапіла Вільню і ўсталявала кантроль над нашымі землямі. А ў 1793 г. Расійская імперыя анексавала цэнтральную частку Беларусі (усходнія землі былі захоплены яшчэ раней — у 1772 г.).

У 1795 г., калі Расія дарэшты захапіла Беларусь, распараджэннем Кацярыны II нашы землі ўвайшлі ў тры створаныя тады адміністрацыйныя адзінкі — генерал-губернатарствы: Беларускае (Полацкая і Магілёўская губерні), Літоўскае (Слонімская і Віленская губерні ды дзве вобласці — Ковенская і Гарадзенская) і Падольскае (Менская, Валынская і Падольская губерні).

Такім чынам, аніякага „ўз'яднання" Беларусі з Расіяй, як гэта доўга тэндэнцыйна сцвярджалася ў савецкай гістарычнай літаратуры, ніколі не было. Меў месца гвалтоўны захоп, у выніку якога тэрыторыя Беларусі разам з беларускім народам была далучана да Расіі і наш пакутны народ на дзвесце гадоў трапіў у маскоўскую нядолю.

Такі лёс быў і вельмі адукаваных, разумных і таленавітых беларусаў Віктара, Адама і Антона Артымовічаў. У Расійскай імперыі ў іх нават нацыянальнасць пісалася не беларуская, а польская альбо расійская.

Віктар Антонавіч Артымовіч нарадзіўся ў Беластоку ў 1820 г. Пра яго маленства і школьныя гады мала што вядома. Але вядома, што бацька Віктара, Антон Фёдаравіч Артымовіч (прафесар матэматыкі і астраноміі Віленскага ўніверсітэта), за вельмі кароткі час зрабіў добрую чыноўніцкую кар'еру, атрымаў 2000 дзесяцін зямлі і фальварак. Ён быў на той час даволі багатым чалавекам. Таму меў грошы, каб даць сыну добрую адукацыю. І сын хутка кончыў Імператарскае вучылішча правазнаўства ў Пецярбургу, якое на той час рыхтавала дзяржаўных служачых, чыноўнікаў вялікага рангу.

З 1842 да 1853 г. Віктар Артымовіч служыў у Сенаце — адным з вышэйшых дзяржаўных органаў Расійскай імперыі, галоўнай функцыяй якога ў той час было „блюсці законы", змагацца са злоўжываннем як у цэнтры, так і ў губернях. З гэтай мэтай Сенат адпраўляў туды сенацкія рэвізіі, у якіх малады Артымовіч рэгулярна прымаў удзел, вывучаючы дасканала дзейнасць чыноўнікаў. Ужо тады Віктар Артымовіч стварыў сабе рэпутацыю вельмі прынцыповага і сумленнага рэвізора, які наводзіў страх на ўсіх хабарнікаў і казнакрадаў. У Сенаце ён даслужыўся да ўпраўляючага справамі.

Віктар Артымовіч

У 1854 г. Віктар Артымовіч быў прызначаны табольскім губернатарам. За пяць гадоў службы ў Табольску ён не толькі зарэкамендаваў сябе надзвычай дзейным кіраўніком губерні, але актыўна вёў барацьбу з хабарніцтвам, навёў парадак у службовых месцах, палепшыў становішча ссыльных. Дарэчы, пасля паўстання 1831 г., а таксама пасля таго, як у 1846 г. 1100 сем'яў аднадворцаў па загадзе міністра ўнутраных спраў Расіі гвалтам былі пераселены з Беларусі на Каўказ і ў многія губерні Расіі, а таксама пасля паўстання 1863 г., ссыльных-землякоў Віктара Артымовіча было ў Табольскай губерні шмат. Губернатар іх не крыўдзіў. Знаходзіў жыллё, працу, дапамагаў. Гэтым учынкам хутка зацікавіліся прадстаўнікі расійскага ўрада і нашага земляка перавялі губернатарам у Калужскую губерню. Але і там ён дапамагаў ссыльным з заходніх рэгіёнаў тагачаснай Расійскай імперыі. За працай і ўчынкамі Віктара Артымовіча вельмі сачылі.

Антон Артымовіч

А калі ссыльных пасля 1863 г. стала ў губернях Расіі павялічвацца, Віктара Артымовіча перавялі на працу ў Варшаву. Тым не менш, там ён доўга не затрымаўся, бо па ўласнай заяве яго зноў перавялі ў Сенат, дзе Віктар Антонавіч пачынаў і дзе адпрацаваў усе астатнія гады свайго жыцця.

Нашага земляка вельмі ўсе паважалі. Ён меў роўны, спакойны характар і дужа паважліва адносіўся да сваіх падначаленых. Нездарма, прызначаючы 34-гадовага Артымовіча губернатарам Табольска, цар Мікалай I, які ўсім „тыцкаў", звяртаўся да яго выключна толькі на „вы".

У 1854 г., незадоўга да свайго прызначэння ў Табольскую губерню, Віктар Артымовіч ажаніўся з Ганнай Жамчужнікавай. З дружнай і таленавітай сям'ёй Артымовіч пасябраваў адразу, калі прыехаў з Беластока ў Пецярбург. З братам жонкі, Аляксеем, ён вучыўся ў адным класе вучылішча правазнаўства. Вельмі любіў бываць у доме Жамчужнікавых. Два браты Аляксей і Уладзімір Жамчужнікавы былі паэтамі, трэці, Леў — мастаком, іх кузен Аляксей Талстой — рускім пісьменнікам. А бацька Ганны Жамчужнікавай быў сенатарам. Шлюб Віктара Артымовіча і Ганны Жамчужнікавай быў вельмі шчаслівым. Ганна перажыла мужа, але апошнія гады свайго жыцця яна збірала матэрыялы пра яго жыццё і дзейнасць. Віктара Антонавіча Артымовіча не стала ў 1893 г.

Адам Артымовіч

Выпіска з метрык, пасведчанне аб заканчэнні вучылішча правазнаўства, дыплом на званне сапраўднага члена Рускага геаграфічнага таварыства, біяграфія, некралог, розныя загады, пісьмы, перапіска, радаслоўная Артымовічаў, матэрыялы сям'і Жамчужнікавых і шмат іншых матэрыялаў захоўваюцца сёння ў Інстытуце рускай літаратуры Расійскай Акадэміі Навук (ф. 11, адзін. зах. 82).

Родны брат Віктара Артымовіча, Адам Артымовіч, быў маладзейшы за брата на 8 гадоў. Ён нарадзіўся ў Беластоку ў 1828 г. Скончыў Беластоцкую гімназію, а ў 1849 г. — Пецярбургскае Імператарскае вучылішча правазнаўства. Дзякуючы вучобе ў гэтым вучылішчы Адам Антонавіч атрымаў даволі высокі чын тытульнага дарадчыка і пачаў службу летам 1849 г. у Першым Дэпартаменце Урадавага Сената Расіі.

З 1857 г. Адам Артымовіч пачаў працаваць чыноўнікам пры Арэнбургскім і Самарскім генерал-губернатары. Потым загадваў канцылярыяй губернатарства. На гэтай пасадзе ён зарэкамендаваў сябе вельмі добра пры падрыхтоўцы вызвалення сялян ад прыгоннага права. Прымаў таксама ўдзел у рэвізіях Заходняй Сібіры. А пасля гэтага Адам Артымовіч стаў працаваць чыноўнікам па важных даручэннях пры Арэнбургскім і Самарскім генерал-губернатары.

1 студзеня 1861 г. наш зямляк быў прызначаны кіраўніком Самарскай губерні Расіі. Як губернатар ён удзельнічаў у рабоце па вызваленню сялян Самарскай губерні ад прыгоннага права па Маніфесце ад 19 лютага 1861 года. Гэтую работу ён выканаў з гонарам, не парушаючы інтарэсаў ні сялян, ні памешчыкаў.

Пры Адаме Артымовічу пачалося фарміраванне ў заволжскіх стэпах Самарскай губерні раёна таварнага земляробства, якое дазволіла забяспечыць рост самой Самары — з 1861 да 1897 г. колькасць самарскіх жыхароў павялічылася на 226%, сярод якіх шмат было беларусаў з паўночна-заходняга краю Расіі. Дзякуючы Адаму Антонавічу ў Самары былі адкрыты тэлеграфная кантора і гарадскі агульны банк.

У 1861 г. па загадзе Адама Артымовіча там быў пабудаваны новы Кафедральны праваслаўны сабор імя Прасвятой Багародзіцы. Губернатар шчыра падтрымліваў будаўніцтва ў горадзе праваслаўных храмаў і каменных пабудоў...

17 красавіка 1862 г. Адама Артымовіча перавялі на пасаду апекуна Адэскай вучэбнай акругі. Прычынай такога паніжэння ў пасадзе стала тое, што наш зямляк выступаў за аддзяленне Самарскай губерні ад генерал-губернатарства. А таксама тое, што ён разам з братам Віктарам (калужскім губернатарам) падтрымліваў цесныя сувязі з рэвалюцыйнымі польскімі гурткамі. Адам і Віктар Артымовічы дапамагалі фінансамі будучым паўстанцам на Беларусі пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага...

2 траўня 1862 г. Адам Антонавіч наладзіў развітальны абед і разам з жонкай паехаў на новае месца службы ў Адэсу. Пры пераводзе на новае месца працы яго нават узнагародзілі ордэнам Святога Уладзіміра трэцяй ступені, а праз тры гады — ордэнам Святога Станіслава першай ступені.

У Адэсе наш зямляк працаваў амаль да смерці. Яго не стала 15 студзеня 1893 г.

Антон Артымовіч (1832-1910) быў самым малодшым братам Артымовічаў. Але пра яго звестак пакуль сабраць удалося мала. Ды і не такім вядомым ён быў у Расіі, як Віктар і Адам. Антон нарадзіўся ў Беластоку ў 1832 г. Быў правадзейным тайным работнікам, потым сенатарам. Яго жонкай стала Вольга Рымская-Корсакава, чые продкі былі беларусамі і паходзілі з Літвы. У іх нарадзілася шасцёра дзяцей. Сярод якіх — Марыя была „классной дамой" у Ніжагародскім Марыінскім інстытуце шляхетных дзяўчат. Сын Уладзімір служыў у Міністэрстве замежных спраў Расіі. А з 1910 г. быў дырэктарам Дэпартамента асабістага складу і гаспадарчых спраў. Яго жонкай была амерыканка Марыяна Гобс...

Каб расказаць пра ўсіх Артымовічаў — беларусаў з Беласточчыны, пра іх дзяцей, унукаў, праўнукаў і прапраўнукаў, неабходна напісаць некалькі тамоў кніг. Тым не менш, яны ведаюць і павінны ведаць, што іх далёкімі продкамі былі праваслаўны беларус (ліцьвін) з Беластока Антон Фёдаравіч Артымовіч і яго сыны Віктар, Адам і Антон Артымовічы. Лёс беларусаў Артымовічаў раскінуў па ўсім свеце. Яны сёння жывуць не толькі ў Расіі, але і ў Польшчы, Беларусі, ЗША, Іране, Францыі, Англіі і ў іншых краінах свету. Магчыма з гэтага роду і слынная наша паэтка Надзея Артымовіч, якая неяк напісала: „І нават тады, калі пацямнее дарога, а вецер і дождж вырасце сцяной, мы будзем ісці да чыстай вады, да ніў залатых і да нашага блакітнага неба".

Заява Рады ГА „Саюз беларускіх пісьменнікаў” аб пераследзе сяброў аб’яднання

Пасля стварэння ў 2006 годзе ГА „Саюз пісьменнікаў Беларусі” (СПБ) з боку ягонага кіраўніцтва праз міністэрствы адукацыі, інфармацыі, юстыцыі, культуры Рэспублікі Беларусь і падпарадкаваныя ім установы мэтанакіравана прадпрымаліся меры па звужэнні сферы грамадскай дзейнасці і па ліквідацыі найстарэйшай творчай арганізацыі Беларусі — Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП). Творчае аб’яднанне пазбавілі ранейшай фінансавай дзяржаўнай падтрымкі і вымусілі пакінуць Дом літаратара. Былі перапісаныя школьныя і ўніверсітэцкія праграмы па беларускай літаратуры, з якіх выкраслілі імёны і творы членаў СБП — народных паэтаў, лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій, майстраў нацыянальнага мастацкага слова. Новаствораному саюзу былі перададзеныя літаратурныя выданні „Полымя”, „Нёман”, „Маладосць”, штотыднёвік „ЛіМ”, заснавальнікам якіх дзесяцігоддзі быў СБП. Распараджэннем міністэрства адукацыі былі забароненыя літаратурныя выступленні членаў СБП у школах, ВНУ і бібліятэках, якое не адменена і да гэтага часу. Літаратараў, якія працуюць у дзяржаўных установах, пачалі пад пагрозай звальнення прымушаць пісаць заявы аб выхадзе з СБП, заснаванага Купалам і Коласам, ды ўваходзіць у новаствораны саюз.

Не зважаючы на жудасныя ўмовы дзейнасці, СБП выстаяў і застаецца самай масавай прафесійнай арганізацыяй літаратараў Беларусі. Новаствораны СПБ, атрымаўшы ад кіраўніцтва краіны з дзяржбюджэту ўсе магчымыя прэферэнцыі (уключна з фінансаваннем дзейнасці апарату), за тры гады свайго існавання не змог вытрымаць творчай канкурэнцыі з СБП — ні па арганізаваных мерапрыемствах, ні па якасці створаных мастацкіх тэкстаў, ні колькасна, ні па ўплывовасці і павазе ў грамадстве. Выкарыстоўваючы адміністрацыйны рэсурс і колішнія чыноўніцкія сувязі, кіраўніцтва новаствораннага СПБ распачало чарговы наступ на СБП і ягоных членаў.

З 2010 года распачалася беспрэцэдэнтная акцыя па шальмаванні і пераследзе членаў нашай афіцыйна зарэгістраванай творчай арганізацыі. Па ўсёй краіне беларускамоўных і рускамоўных паэтаў, празаікаў і крытыкаў зноў пачалі выклікаць у дзяржаўныя інстанцыі ды ўльтыматыўна патрабаваць выйсці з СБП.

Ганебныя і незаконныя „працэсы” мелі месца ў сталіцы і ўсіх рэгіёнах Беларусі (у РВУ „Літаратура і мастацтва”, выдавецтве „Мастацкая літаратура”, Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі, БДУ, БНТУ, БДЭУ, БДПУ і інш., абласных універсітэтах, рэдакцыях газет, музеях і школах). Па нашых звестках, гэтая „кампанія” санкцыянаваная вышэйшымі ўладнымі структурамі Беларусі.

Алесь Пашкевіч - старшыня СБП

Толькі на працягу апошніх тыдняў каля сотні членаў СБП звярнуліся да кіраўніцтва і Рады свайго грамадскага аб’яднання з просьбай аб дапамозе і абароне іх грамадзянскіх правоў, гарантаваных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і Законам аб грамадскіх аб’яднаннях. Да прыкладу, распачаты адміністрацыйныя і псіхалагічныя здзекі нават у дачыненні да паэтэсы, якая жыве ў Чарнобыльскай зоне і на мізэрны заробак адна выхоўвае дваіх непаўнагадовых дзяцей...

Падобнага масавага пераследу беларускія творцы не памятаюць са сталінскіх часоў.

Улічваючы вышэй выкладзенае, у мэтах выканання статутных палажэнняў нашага аб’яднання і спасылаючыся на адпаведныя законы і Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, Рада СБП **патрабуе:**

— неадкладна спыніць пераслед пісьменнікаў, членаў ГА „СБП”;

— даць належную ацэнку дэструктыўнай дзейнасці кіраўніцтва СПБ на чале з М. І. Чаргінцом, якая наносіць непапраўную шкоду развіццю сучаснага літаратурна-грамадскага працэсу і нацыянальнай культуры ў цэлым.

У адваротным выпадку мы вымушаны будзем звярнуцца за падтрымкай у міжнародныя арганізацыі, паўнапраўнымі членамі якіх з’яўляецца СБП: Міжнародную супольнасць пісьменніцкіх саюзаў (Масква), Еўрапейскую пісьменніцкую раду (Брусель), Балтыйскую пісьменніцкую асацыяцыю (Стакгольм), Міжнародную асацыяцыю пісьменніцкіх саюзаў „Слова без межаў” (Кіеў) і да іншых нашых партнёраў. Разам з гэтым пакідаем за сабой права на правядзенне ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку грамадскіх акцый пратэсту па абароне правоў членаў ГА „Саюз беларускіх пісьменнікаў” на працу і ўдзел у грамадскіх арганізацыях.

Прынята адзінагалосна 3 лютага 2010 г.

Каханне можна сустрэць паўсюль і калі заўгодна. Няма таго месца на зямлі, дзе б мужчыны і жанчыны не адчувалі сімпатыі адзін да аднаго, вяршыняй чаго з’яўляецца жаданне быць разам. У той жа час хапае і самотных асоб, якія па розных прычынах яшчэ не знайшлі свайго шчасця.

Адным са спосабаў барацьбы з уласнай самотай з’яўляюцца сайты знаёмстваў у інтэрнэце. Беларускі сэгмент сусветнага павуціння таксама змяшчае віртуальныя „клубы самотных сэрцаў”, даючы магчымасць знайсці сваю другую палову. Сайт, што месціцца па адрасе **http://spatkanne.by-eu.com**, мае і адпаведны дэвіз: „Спаткай сваю мару”.

Галоўнае адрозненне данага сайта ад іншых падобных у тым, што ён цалкам беларускамоўны. На ім могуць паразмаўляць, знайсці агульныя інтарэсы і, можа, нават, пакахаць адзін аднаго хлопцы і дзяўчаты, якія лічаць для сябе важным карыстацца беларускай мовай.

„Надоело говорить :(?” — „Размаўляй :)!!!” Менавіта ў падтрымку дадзенай кампаніі аматарамі быў створаны сайт беларускамоўных знаёмстваў „Спатканне”, — прэзентуюць свой праект яго аўтары. — Гэта не проста сайт з пошукам анкет, а сапраўдная сацыяльная сетка беларускамоўнага асяроддзя: чат, форум, супольнасці, блог, унутраная пошта, гаманілка, аб’явы, узаемадапамога, імпрэзы, паштоўкі і шмат-шмат-шмат яшчэ чаго :) Вы ўжо адразу будзеце здольны стварыць старонку, якая дазволіць Вам падрабязна апісаць свае захапленні, звычкі, характар, і, вядома, знешнасць. Цяпер шукаць сваю палову стала яшчэ лягчэй! Ацаніце ўсе магчымасці дадзенага сайта і Вы пераканаецеся, што зрабілі правільны выбар :)!”

Адной з галоўных вартасцей падобных сайтаў з’яўляецца як мага большая колькасць зарэгістраваных карыстальнікаў, якія пакідаюць там свае анкетныя даныя. Вось тут пакуль у „Спаткання” не ўсё вельмі добра — на сайце маюцца анкеты каля 120 дзяўчат і каля 180 хлопцаў. Выбар хоць і ёсць, але не надта шырокі. Праўда, з пункту гледжання беларускамоўнасці зносін, гэты выбар будзе найбольш якасны.

Інтэрфейс сайта даволі прывабны. На блакітным фоне месціцца невялікая мультыплікацыйная застаўка з сэрцайкамі, выявы прытуленых адзін да аднаго хлопца і дзяўчыны, а таксама фотаздымкі ўдзельнікаў, што памясцілі на сайце свае анкеты. Зразумела, тут не абысціся без пошуку. Для таго, каб знайсці патэнцыяльна цікавую для карыстальніка асобу, ён мусіць абазначыць яе пол, узрост і мясцовасць.

Стваральнікі сайта вельмі дбайна падышлі да яго зручнасці для карыстальнікаў. У рубрыцы „Дапамога” месцяцца адказы на часта задаваныя пытанні, сярод якіх — як правільна размясціць фотаздымак, дзе лепей пакідаць свае выказванні, як можа выразіць сваю сімпатыю чалавек, які саромеецца ўласных пачуццяў.

Адна з цікавых рубрык сайта — „Гэта цікава ведаць”. На ёй размешчаны так званы маладзёвы слэнг, які ўжываюць у размовах некаторыя хлопцы і дзяўчаты, бачачы ў ім спосаб адрознення ад іншых людзей. Праўда, засталося загадкай, чаму некаторыя слэнгавыя словы і выразы тлумачацца па-беларуску, а некаторыя папросту перакладзены на рускую мову.

Сайт яшчэ можна ўдасканальваць — не ўсе пазначаныя старонкі змяшчаюць інфармацыю. Да такіх належыць старонка „Нашы гісторыі”, дзе месціцца пакуль толькі здымак хлопца і дзяўчыны, што абдымаюцца пад бел-чырвона-белым сцягам.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Алімпійскі прыцэл

На алімпійскіх гульнях у Ванкуверы выступіць 49 беларускіх спартоўцаў. Гэта не так шмат. Прыкладам у японскім Нагана ў 1998 г. былі 62 прадстаўнікі, а ў амерыканскім Солт-Лэйк-Сіці ў 2002 г. — рэкордныя 65. Сярод сёлетняга складу натуральна пераважаюць хакеісты, якіх 23. У абойме Міхаіла Захарава дастаткова праверaных дасведчаных штыкоў — галкіпер Андрэй Мезін, абаронцы Руслан Салей і Аляксандр Макрыцкі, форварды Алег Антоненка, Сяргей Задзялёнаў, Аляксей Калюжны, Канстанцін Кальцоў. Дарэчы, удзел у форуме форварда „Таронта” Міхаіла Грабоўскага пад вялікім пытаннем. Вельмі верагодна, што з-за траўмы клуб не дазволіць яму выступіць. Яшчэ 6 хакеістаў знаходзяцца ў рэзерве. Паўтарыць поспех 2002 г. (сенсацыйнае 4-е месца — лепшы вынік у гісторыі айчыннага хакея на топтурнірах) малаверагодна, але шанцы ў гульнёвых відах ёсць заўсёды.

Таксама ў Канадзе выступяць 10 біятланістаў — па 5 мужчын: Рустам Валіулін, Сяргей Новікаў, Міхаіл Сямёнаў, Яўген Абраменка і Аляксандр Сыман і жанчын: Вольга Назарава, Дар’я Домрачава, Вольга Кудрашова, Людміла Калінчык і Надзея Скардзіна. Тут усе надзеі на ўдачу Домрачавай. Заліковыя ачкі можа прынесці і жаночы эстафетны квартэт.

Паспрабуюць пашукаць алімпійскага шчасця 3 лыжнікі: Сяргей Далідовіч, Аляксей Іваноў, Леанід Карняенка і 4 лыжніцы: Вольга Васілёнак, Настасся Дубарэзава, Кацярына Рудакова і Вольга Саннікава. З усяе гэтай кампаніі не выклікае сумневу толькі клас Далідовіча, для якога гэтая алімпіяда напэўна будзе апошняй. Ён неаднаразова трапляў у прызёры на розных гонках. Крыху дзіўна, але большага ў кар’еры дабіўся Карняенка. У 2007 г. ён стаў ажно сярэбраным прызёрам чэмпіянату свету, але пасля быў абсалютна далёкі ад такога высокага выніку. У цэлым лыжныя гонкі ў Беларусі занядбаныя. Апошнія гады гэты від „адзначыўся” найперш карупцыйнымі скандаламі.

Шасцёрка фрыстайлістаў — спрэс вядомыя персоны сусветнага спорту: Дзмітрый Дашчынскі, Аляксей Грышын, Цімох Слівец, Антон Кушнір, Ала Цупер і Асоль Слівец. Нагадаю, што Дашчынскі быў бронзавым прызёрам у Нагана (1998) і сярэбраным у Турыне (2006), а Грышын — бронзавым у Солт-Лэйк-Сіці (2002). Зараз жа галоўны фаварыт Кушнір, які нядаўна выйграў так званы малы Крыштальны глобус у акрабатычных скачках. Самая пара замахнуцца і на вялікі, які даецца лепшаму ў свеце ва ўсіх відах фрыстайла. Толькі прагнозы ў такім экстрэмальным відзе — рэч няўдзячная. У кожным разе зборная пад кіраваннем Мікалая Казекі падаецца грознай сілай для асноўных сапернікаў. А яны будуць прадстаўляць Кітай, Швейцарыю, Паўночную Амерыку.

Таксама будуць прабаваць сваіх сіл гарналыжніцы Марыя Шканава і Лізавета Кузьменка. Гарналыжны слалам толькі пачынае развівацца ў нашай краіне. А вось канькабежны спорт меў свае неблагія традыцыі. Дастаткова прыгадаць Эдуарда Матусевіча, які заняў 6-е месца на алімпіядзе ў Інсбруку ў далёкім 1964 г. А першы суверэнны медаль на зімніх алімпіядах здабыў для Беларусі Ігар Жалязоўскі ў нарвежскім Лілехамеры (1994). У Ванкуверы выступіць толькі адна наша прадстаўніца — Святлана Радкевіч, якая аб’ектыўна на высокае месца прэтэндаваць не можа.

Алімпіяда стартуе ўжо на гэтым тыдні, шкада, што яна праводзіцца так далёка. Але ў кожным разе жадаю прыемных тэлевізійных праглядаў і станоўчых эмоцый!

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Нараўчанская гміна

Снег на вуліцы

У першай дэкадзе студзеня г.г. снегу было хоць адбаўляй. Ляжаў ён і напрыканцы снежня. На першай снежаньскай сесіі Гміннай рады ў Нараўцы адзін з радных гаварыў пра заснежаныя тратуары ў Нараўцы і ў Ляўкове. Прапанаваў, каб пажылым жыхарам вёсак дапамаглі ў гэтай справе члены добраахвотных пажарных каманд (ДПК), члены ЛЗС, гарцэры ды яшчэ і пагранічнікі, якіх у нас шмат. Але дзе там, усе замахалі рукамі: што вярзеш такое! А камендант ДПК захацеў 20 злотых за гадзіну, як ім плацяць у выпадку тушэння пажару. Вось яно як. Зараз усё на грашах стаіць. Ніхто не зойменца ў грамадскім пачыне. Хтосьці з залы падчас той сесіі падказаў войту, каб да адгортвання снегу паслаць чыноўнікаў з Гміннай управы. Столькі іх там! Але войт сказаў: „Прыйдзе сакавік і снег растане. Толькі вада паплыве. А інакш паплывуць грошы з гміннай касы". Праўда, мудра сказана...

Перад Калядамі ў 2010 годзе ў Ляўкове Новым і Старым можна было так-сяк ісці па новапабудаваным тратуары. Пра гэта паклапаціліся ўсе, хто тут яшчэ пражывае. Горш было толькі насупраць двароў, з якіх людзі з'ехалі на зіму ў горад або якім пад 90 гадоў. Ёсць, што праўда, тры двары, з якіх ніхто не выйшаў з лапатай ці мятлой. Да іх павінна завітаць паліцыя. Па-добраму не будуць слухаць.

Зараз найбольшыя гурбы снегу на прыпынках аўтобусаў ПКС у Новым Ляўкове і Старым Ляўкове. За іх адказныя гмінныя ўлады, але з іх боку ніякага зруху.

Я чуў, што гэта павінны рабіць радныя і солтыс. Іх жа выбіралі! Таму яны павінны старацца. Радны з Новага Ляўкова дае прыклад. Вазьміце і іншыя.

Ян ЦЕЛУШЭЦКІ

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

На вуліцы ў Кузаве

Дакучлівая зіма

Калі летам дакучае сонца і пануе засуха, дык просім Усявышняга, каб пайшоў дождж або паступіла зіма, бо хочам захапляцца чароўнасцю чарговай пары года. На жаль, натура нікому не падпарадкоўваецца — карыстаецца сваімі правіламі і таму робіць сюрпрызы. Бывае, што на Каляды падорыць нам дождж, а напрадвесні — снег і замаразкі.

Сіноптыкі прадвяшчалі, што сёлетняя зіма будзе снежная і марозная Але мала хто ім верыў. Зараз прагноз збываецца. Шчодра сыпнула снегам, насталі лютыя маразы. Краіну ахапіў параліч. Дзесяткі тысяч гаспадарак засталося без электрычнага току, пачасціліся шматгадзінныя спазненні цягнікоў і дарожныя аварыі, зафіскавана больш двухсот смяротных ахвяр ад ахалоджання арганізма. Вось такі вынік сёлетняй зімы.

У Чаромхаўскай гміне сёлета справа зімовага ўтрымання дарог крыху лепш маецца. Пасля снегападу расчышчалі вуліцы, а ў час галалёдзіцы пасыпалі іх пяском. Нават роварам можна было праехаць, чаго нельга сказаць пра мінулыя зімы, бо ўсяляк бывала.

Дзяржаўная эканоміка пацярпела шматмільённыя страты, але на канчатковы падлік урону трэба пачакаць да вясны. Каб адно да гэтых затрат не далучыліся яшчэ кошты веснавых паводак, бо пры так шчодрым снежным покрыве і сюрпрызах натуры ўсяго можна спадзявацца. Як прадвяшчаюць сіноптыкі, вясны трэба будзе чакаць яшчэ больш месяца.

Уладзімір СІДАРУК

Нараўчанская гміна

Зацікаўленне „Нівай"

У гэтым годзе выйшла ўжо пяць нумароў „Нівы" (пішу гэта 2 лютага). Усе экземпляры нашага беларускага часопіса „разышліся" па крамах ГСу ў Старым Ляўкове і ў Плянце. Адгэтуль г.зв. „зваротаў" не будзе. Гэты факт згодны пацвердзіць прадаўшчыцы Ірэна Лаўрашук і Яніна Ляткоўская. А ў мінулым годзе „Ніва" залежвалася на паліцах. А цяпер „Ніву" пачалі купляць. Да роднага часопіса вярнуліся Галіна Бірыцкая і Аляксандр Здаеноўскі з Плянты, Яўген Смольскі, Лідзія Галубоўская і Канстанцін Целушэцкі з Новага Ляўкова.

1 лютага г.г. пытаўся я пра „Ніву" ў крамах ГСу ў Нараўцы. У дзвюх крамах купілі па два экземпляры. Беларускі штотыднёвік купляе мясцовая настаўніца беларускай мовы Анна Кандрацюк. Пятым нумарам пацікавілася Зіна Пацэвіч з Нараўкі, якая спявае ў мастацкім калектыве „Нараўчанкі".

„Ніва" з беларускім календаром знаходзіцца на відным месцы на пошце ў Нараўцы. Пра яе яшчэ пытаюцца.

У Гайнаўцы

Кончыцца зіма і ўсё больш і больш юнакоў убачым на спартыўных пляцоўках. Будуць яны займацца перад усім футболам. І будзе гэтак як і ў мінулыя гады бывала.

Зараз у Гайнаўцы няшмат спартыўных пляцовак. Але вось пра іх паклапаціліся жыллёвы кааператыў ды гарадскія ўлады. Пабудавалі яны некалькі новых спортпляцовак, між іншым па вуліцы Доўгай, Мармуровай, Ліпавай (дзве), Паддольнай, Лебядзінай ды па вуліцы Тамары Саланевіч.

(яц)

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Казіміра Сваяка.

1. група разбойнікаў = 51 _ 52 _ 45 _ 29 _ 30 _;
2. адчуванне пакуты = 78 _ 82 _ 83 _ 84 _;
3. валакністы матэрыял для медыцынскіх і тэхнічных мэт = 64 _ 65 _ 103 _ 46 _;
4. сухавей, брыз або буралом = 88 _ 89 _ 90 _ 50 _ 25 _;
5. верхняе пакрыццё будынка = 93 _ 102 _ 101 _;
6. дзядзькава жонка = 81 _ 80 _ 79 _ 53 _ 54 _ 55 _ 85 _ 33 _;
7. невялікая будыніна для дробнага гандлю = 76 _ 77 _ 96 _ 61 _ 37 _;
8. дзяржава з Пекінам = 104 _ 105 _ 2 _ 99 _ 100 _;
9. горад на Гродзеншчыне з касцёламі фарным і піяраў = 62 _ 63 _ 7 _ 8 _;
10. яўрэйскія праснакі з пшанічнай мукі пад Пасху = 73 _ 48 _ 95 _ 94 _;
11. ручная зброя для кідання камянёў = 97 _ 87 _ 71 _ 58 _ 59 _ 60 _;
12. Белавежская вакол Белавежы = 1 _ 3 _ 9 _ 10 _ 11 _;
13. невялікі асобны манастыр у глухой мясцовасці = 44 _ 41 _ 42 _ 75 _;
14. над падлогай = 40 _ 24 _ 16 _ 17 _ 18 _;
15. бел-чырвона-белае палотнішча або Union Jack = 34 _ 35 _ 36 _ 47 _;
16. вертыкальная частка будынка Васіля Быкава і Сакрата Яновіча = 12 _ 13 _ 14 _ 66 _ 67 _;
17. тайны агент вышуковай паліцыі = 21 _ 86 _ 31 _ 32 _ 6 _ 70 _;
18. грашовае выражэнне вартасці тавару = 5 _ 28 _ 19 _ 20 _;
19. маскоўскі манарх = 91 _ 92 _ 68 _;
20. наглядчык за працай прыгонных сялян = 22 _ 23 _ 15 _ 69 _ 49 _;
21. паслухмянае дзве каровы ссе = 56 _ 57 _ 98 _ 43 _;
22. персідскі манарх = 4 _ 74 _ 72 _;
23. іспанская рака ў Сарагосе = 26 _ 27 _ 38 _ 39 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 2 нумара

Год, Ева, егер, Укаялі, урок, ціс.

Рашэнне: **Усе героі, калі вораг уцякае.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лявону Федаруку** з Рыбал.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (12)

Ганна КАНДРАЦЮК

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Вуліца ў Гарошкаве

Кожны, хто вандраваў па Беларусі, ведае колькі часу і нерваў зжырае праблема прапіскі. Мы яшчэ не даехалі ў Гарошкаў, як пачалі сушыць мазгі рэгістрацыяй пабыўкі. З-за апошняй калатнечы аж не хацелася сыходзіць з цягніка. Каб справіцца ў трох дазволеных без прапіскі сутках, мы павінны былі з'ехаць яшчэ ў той самы дзень што і прыехалі. Апошні варыянт не даваў гарантыі, што на час паспеем дабрацца на мяжу і мы, прыкладова, маглі б не дастаць квіткоў на паваротны цягнік з Рэчыцы ў Гродна. І будзь тут разумны...

Спачатку, дзеля адной прапіскі, мы хацелі спыніцца ў Рэчыцы, пасяліцца ў нейкай гасцініцы, набыць рэгістрацыю і адразу ехаць у вёску паэта. Ранейшыя досведы падказвалі, што „ад рукі" нам не паставяць патрэбнай пячаткі. Паколькі набліжаліся выхадныя дні, справа магла б зацягнуцца да панядзелка. Словам — кашмар! У такой неразбярысе сваю ролю іграюць падказкі сяброў. Калі пазваніў нам Сяргей Сыс і падказаў ехаць ў Гарошкаў, мы мігам прыдумалі яшчэ адзін варыянт: за прапіскай пойдзем у мясцовы сельсавет. У справе начлегу ў нас не было вялікіх патрабаванняў.

— Як не будзе месца ў хаце, то заначуем на саломе або сенавале, — падумалі мы ўголас.

Паводле сталічных блогаў сам паэт *спаў да восені на сенавале ў хляўку. Любіў выпіць. Ездзіў у Сібір вывучаць жыццё.*

* * *

У Гарошкаве ўжо з парога мы зразумелі, што Анатолевы начлегі на сенавале — чыстая праява экстравагантнасці. Жыццё-быццё ў ягонай вёсцы мала ў чым адрознівалася ад гарадскога. Нам нават не дазволілі пяшком ісці ў сельсавет. Вяскоўцы з канца ў канец вёскі перамяшчаюцца на сваіх машынах або на гарадскіх маршрутках, якія заязджаюць з суседняй Рэчыцы. Праўда, вёска цягнецца аж пяць кіламетраў паўз шырокую даліну Дняпра, далей спалучаецца з Заспай, каб разам выглядаць як адзін гарадскі пасёлак. Аднак Гарошкаў і Заспа розныя як неба і зямля ў ментальным сэнсе. У Заспе, дзе сельсавет, парк, школа, мала дзе пачуеце беларускую мову. Пасля чарнобыльскай катастрофы туды перасялілі шматлікіх жыхароў зоны з многіх, часам адлеглых вёсак. Мясцовы дыялект адразу саступіў месца славутай *трасянцы* і ўсякай саветчыне. Апошнюю асаблівасць мы спазналі на ўласнай скуры. Згодна плану мы паехалі ў сельсавет за прапіскай. Спачатку нам загадалі чакаць аж вернецца з аб'езду

Фота Міры ЛУКШЫ

У чаканні прапіскі

па глыбінцы спадарыня старшыня. Без яе тут не ўмелі адказаць на самае простае пытанне: *ці можна ў іх прапісацца?* Калі ўлічыць беларускія меркі, нас „абслужылі" мігам. Вяртання кіраўніцы нам прыйшлося чакаць толькі пяцьдзесят пяць хвілін. Праўда, пасля яе вяртання мы нічога так і не даведаліся, і не аформілі. Жанчына аглянула нас з галавы да ног, падумала і параіла з'ездзіць за прапіскай у Рэчыцу.

* * *

Адна са сталічных легенд апавядае быццам Анатоль Сыс прапісаў Міру Лукшу і Ганну Кандрацюк у сваім родным доме ў Гарошкаве!

Для ўсіх, хто сумняваецца ў апошнім цудзе, мы можам паказаць пячаць Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, якая пацвярджае наш пяцідзённы побыт у хаце паэта. Прэстыжны побыт аднатаваны ў нашых пашпартах. Увесь смак у тым, што хата ад смерці паэта стаіць пад замком, і ў ёй няма гаспадара...

З Заспы мы адразу пагналіся ў Рэчыцу. У матэрыялізацыі згаданай легенды мы абавязаны Людзе Бельскай, сваячцы Анатоля. Людміла загрузіла нас у сваю машыну і без аглядкі павезла ў Рэчыцу.

— А што рабіць! — сказала яна. — Мусова падзейнічаць!

Сказаць праўду, мы ўжо не разлічвалі на ўдачу. Нам асталося менш за трыццаць хвілін да закрыцця ўстановы. За такі час — я прыгадала апошні досвед з прапіскай у 2007 годзе — мы не паспелі б запоўніць той кучы папер, якой на *добры дзень* закідалі замежнікаў...

У Рэчыцы нас афармілі на працягу дзесяці хвілін, ветліва і прафесійна, аж не хацелася верыць. Замест дзесяці бланкаў мы запоўнілі адзін лісток. Да гэтага нам трэба было пайсці ў банк і асабіста заплаціць за прапіску (каля 10 долараў ад асобы). Пасля нас прапісалі „ад рукі" і пажадалі прыемнай пабыўкі. Калі гаварыць пра цуд — мы былі апошнімі наведвальнікамі ў бюро і мелі шчасце, бо толькі па пятніцах установа працуе да восьмай гадзіны вечара.

— А чаму вас не прапісалі ў Заспе? — пацікавілася яшчэ на развітанне чыноўніца.

Мы не ведалі што думаць і толькі паціснулі плячыма. Ды адказ на гэтае пытанне, мабыць, ведаў адзін Анатоль Сыс.

(працяг будзе)

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

У Рэчыцы ля вакзала

14.02 — 20.02

(22.03. — 20.04.) Будзеш засяроджаны і здольны да вялікага высілку. Нішто не выведзе цябе з нерваў. Не дзейнічай адзін. Шмат паскладваеш у сваёй пары, але не пазбягай цяжкіх размоў. Калі і прытрапіцца перашкода, не змяняй ходу падзей.

(21.04. — 21.05.) 15-19.02. — найшчаслівейшыя дні ў гэтым месяцы. Будзеш радасны, усё ўдасца, гарантаваны поспех у любой галіне, пачнеш рэалізаваць адважныя планы. Твая адкрытасць і сардэчнасць схільваюць да цябе людзей. Быкі з 15-19.05. могуць наракаць на недахоп энергіі.

(22.05. — 22.06.) Пастарайся запанаваць над эмоцыямі, каб не зрабіць памылкі, якой вынікаў не адвернеш. Валянцінкі не будуць пераломам; не абмануць цябе салодкія слоўцы. На сваё здароўе павінны звярнуць увагу Блізняты народжаныя да 27 мая.

(23.06. — 23.07.) Знакамітае чуццё, дзе можаш найбольш зарабіць. Калі стомяць цябе інтарэсы, зоймешся каханнем. 14 і 15.02. старайся нічога не змяняць, бо могуць быць нямілыя вынікі. Магчымыя непрыемныя сітуацыі з-за саперніка, які толькі цікуе, каб зрабіць табе падножку.

(24.07. — 23.08.) Цяжкавата — крок наперад, два назад... На шчасце, незалежна ад цяжкасцей, дасі рады. Пасля 15.02. рыхтуецца паляпшэнне ў фінансах. Не рассакрэчвай сваіх таямніц перад знаёмымі, якія ўжо цябе падвялі. Каб быць пераканаўчым, мусіш адчуваць сябе ў сваёй скуры; не бярыся за тое, у чым завельмі не разбіраешся.

(24.08. — 23.09.) Многа запалу. Рассакрэціш адну загадку. Частку грошай, якую ты ўваліў без толку, можа ўдасца вярнуць. Рашучае паляпшэнне псіхафізічнай кандыцыі.

(24.09. — 23.10.) Карысныя змены на працы. Можаш пасябраваць з новым калегам. Сімпатычнае знаёмства на працы можа змяніцца ў гарачую сувязь. Можаш хораша схуднець, нават не стараючыся.

(24.10. — 22.11.) Старанліва плануй кампанію на валянцінкавую забаву (найлепшыя адносіны з Шалямі, Быком і Дзевай). Твае знаёмыя ахвочыя да гульняў. Заспакоіш свае прафесійныя амбіцыі. Твая ўява будучыні можа зусім не падыходзіць да сямейных планаў, што 14.02. можа давесці да скандалу.

(23.11. — 22.12.) 15-19.02. нагоды для мілага правядзення часу. Нават нудныя абавязкі не будуць злаваць. Адпачнеш, сустрэчы ў кампаніі будуць вельмі файныя. Паможаш людзям (табе падтрымка цяпер лішняя). Сярод сяброў будзеш выбіраць старэйшых.

(23.12. — 20.01.) Разважныя думкі, тактычныя дзеянні. Дзякуючы паслядоўнасці і ўпартасці пераможаш усе перашкоды. Прафесійны і фінансавы поспехі. 16-20.02. не крытыкуй завостра, бо можаш цалкам парваць сувязі.

(21.01. — 19.02.) Някепска ў матэрыяльных справах. Бачацца добрыя фінансавыя перспектывы. Вакол цябе сябры, на якіх можаш заўсёды разлічваць. Пацікаўся натуральнымі метадамі лячэння.

(20.02. — 21.03.) Адпачні ад штодзённай гонкі. Не вельмі будзе табе хацецца гуляць (асабліва ў „валянцінкі"). Ды і так цябе заўважаць. Пачнеш дзейнічаць з размахам. У пары чарговая праверка пачуццяў. Добрыя дні для паразумення, таксама і ў прафесійных перагаворах. Дзве апошнія дэкады лютага — знакаміты час на асаблівае (і паспяховае) дбанне аб красу і здароўе.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960